ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЛІСТАПАДА 2017 г. ЧАЦВЕР №226 (28590)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Чэмпіён-бодзібілдар з МНС**



**Паміж «лайкамі» і рэальнасцю**



**«Дзяды» і навабранцы Антарктыды**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ірына ГЛІНСКАЯ, намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя:**

*«Магчымасцю абараніцца ад грыпу з дапамогай прышчэпкі ўжо скарысталіся больш за 3 млн жыхароў Беларусі — каля 35% насельніцтва. Кампанія вакцынацыі працягваецца, таму магчымасць зрабіць прышчэпку ячшэ ёсць. Сезонная цікавасць да вакцынацыі звычайна рэзка ўзрастае ў студзені — лютым, калі з'яўляецца першая інфармацыя пра цяжкія выпадкі захворвання ў іншых краінах. На тое, каб пасля вакцынацыі ў арганізме выпрацавалася абарона, неабходна 2—3 тыдні. Калі вірус ужо актыўна цыркулюе, мы можам з ім сустрэцца раней, чым выпрацуецца гэтая абарона».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.11.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 2,0031 ▼ |
| Еўра | 2,3553 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0339 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0750 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Тураўскі дабравест



Тураўскі школьнік Кірыл ПАТАПЕНКА любіць падымацца на званіцу новага гарадскога сабора ў гонар свяціцеляў Кірыла і Лаўрэнція Тураўскіх і з дазволу служыцеляў царквы рабіць перазвоны — склікаць людзей на набажэнства.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

*Жыткавіцкі раён.*

■ Нерухомасць

## ЦЭНЫ НА ЖЫЛЛЁ ПАЛЕЗЛІ ЎГОРУ?

Праўда, эксперты кажуць, што гэта ілюзія




**Па даных аналітычнага аддзела www.pro-n.by, сярэдняя цана прапановы кватэр на другасным рынку ў Мінску па стане на другую дэкаду лістапада складала 1189 долараў. У параўнанні з папярэднім месяцам цана павялічылася на 21 долар, або на 2%.**

**У кастрычніку цэны на кватэры ў Мінску паказалі нечаканы рост. Але гэта — гульня лічбаў і не больш за тое, упэўнены спецыялісты. Да глыбокай восені кліенты паступова раскупілі недарагое жыллё, якое аказвала ўплыў на сярэднюю цану квадратнага метра. А кватэры, выстаўленыя на продаж крыху даражэй, засталіся ў базе прадаваных кватэр. Попыт пакупнікоў па-ранейшаму знаходзіцца ў сегменце таннага жылля. А некаторая частка грамадзян, якія прадалі сваю кватэру, будзе выбіраць сабе наўзамен кватэру ў новабудоўлі.**

СТАР. 4

■ Без бар'ераў

## «ДАСТАТКОВА ЗРАБІЦЬ ЗВАНОК...»

**«Штурман» прыходзіць на дапамогу невідушчым людзям**

**«Я выйшаў на вуліцу, а за ноч выпаў снег... І цёр усе мае звыклыя арыенціры, — расказвае невідушчы Арцём. — Раней я павінен быў стаяць і мерзнуць, чакаючы выпадковага чалавека, які прыйдзе на дапамогу. Зараз дастаткова аднаго званка праз мабільную праграму «Штурман» — і валанцёр імгненна дапамагае мне зарыентавацца».**



**Яшчэ не так даўно ў дапамогу невідушчаму чалавеку былі толькі белы кіёк ды спецыяльна навучаны сабака-павадыр, які, дарэчы, каштаваў зусім не танна. Новыя тэхналогіі значна спрасцілі жыццё такіх людзей. Але трэба зразумець адну рэч: каб атрымаць больш магчымасцяў — самім трэба зрабіць крок ім насустрач.**

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Беларусь-Малдова

# СЯБРОЎСТВА СВЕТЛАЕ, ЯК ГРОНКА ВІНАГРАДА

**Самі малдаване гавораць пра тое, што на геаграфічнай карце абрыс іх краіны згадвае гронку вінаграда. Што ўжо само па сабе сведчыць аб сонечнасці і цеплыні краіны, дзе жывуць працавітыя людзі, якія сустрэнуць госця келіхам адмысловага вінаграднага пітва і пачастуюць мамалыгай — найсмачнейшай нацыянальнай стравай. Менавіта такімі — сардэчнымі і сяброўскімі — ведаюць беларусы з даўніх часоў малдаван.**

Днямі дыпламатычным стасункам, якія завязаліся паміж краінамі ўжо падчас самастойнасці нашых дзяржаў, спаўняецца 25 гадоў. Гэта гістарычная дата вартая свайго асэнсавання.

Што адметнага з'явілася ў плане дзелавога ўзаемаабмену? Як палітыка вялікай дыпламатыі адбілася на ўзаемаадносінах двух, без перабольшвання, братэрскіх народаў? Якой бачыцца будучыня нашага супрацоўніцтва? Гэтыя і іншыя пытанні мы адрасавалі Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Рэспублікі Малдова ў Рэспубліцы Беларусь Віктару САРАЧАНУ.

***— Віктар Васільевіч, што Вы ведалі пра Беларусь да таго, як у маі гэтага года прыбылі ў нашу краіну з дыпламатычнай місіяй?***

— У маёй памяці падзеі 1997 года, калі нашы краіны мелі пэўнае падабенства ў вызначэнні самастойнага шляху. Няпростае тады стаяла пытанне: як і куды рухацца далей? І вось цяпер я ў непазнавальна іншай Беларусі. Тут якую сферу ні вазьмі — прамысловасць, сельскую гаспадарку — усё працуе. На высокім узроўні медыцына, бытавое абслугоўванне. Кожны горад — Бабруйск, Мазыр, Гомель — адметны, прыгожы па-свойму. Колькі ж патрэбна было сіл і сродкаў, каб узняць краіну, забяспечыць ёй росквіт!?

**Малдова з'яўляецца адной з вядучых у Еўропе краін па ахопленасці інтэрнэтам, па развіцці ІТ-тэхналогій.**

***— Час даў штуршок і развіццю дыялогу паміж нашымі краінамі...***

— Тыя абставіны, якія склаліся за 25 гадоў незалежнасці, калі, не пытаючыся, нас развялі па розных кутах, пакінулі свой адбітак на нашых узаемаадносінах. Тым не менш беларуска-малдаўскае партнёрства прыкметна вылучаецца сярод іншых краін. У нас вельмі цесныя сувязі ў палітыка-дыпламатычных стасунках: адбылося пяць візітаў прэзідэнтаў, чатыры візіты старшынь парламентаў, столькі ж візітаў прэм'ер-міністраў. Літаральна сёлета Беларусь наведаў прэм'ер-міністр Малдовы Павел Філіп. Вельмі плённай аказалася рабочая паездка прэзідэнта Малдовы Ігара Дадона. Звяртаюць на сябе ўвагу шчырыя асабістыя стасункі паміж прэзідэнтамі нашых краін. Мы асабліва цэнім выказанае Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

разуменне нашых праблем і гатоўнасць аказаць любую дапамогу.

***— Пра які беларускі след у Малдове мы можам сёння гаварыць?***

— Надаём вялікае значэнне міжурадавай беларуска-малдаўскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ў разрэзе тавараабароту, які, спадзяёмся, у гэтым годзе дасягне 200 млн долараў.

Апошнім часам вядзецца палітыка не проста гандлю, а выкарыстання кааперацыйных схем. Прыкладам таму — вытворчасць тралейбусаў ААТ «Белкамунмаш». За тры гады сабрана больш за 300 тралейбусаў, якія сертыфікаваны ў Малдове і могуць быць рэалізаваны на іншых рынках як малдаўскі прадукт.

Такая ж сітуацыя і з трактарамі малой магутнасці — іх збіраюць у Тамаі (Гагаузія). Прадпрыемства маладое — працуе ўсяго год — але мае перспектывы насычэння трактарамі ўсяго поўдня былога Савецкага Саюза, дзе традыцыйна растуць вінаграднікі, нізкарослыя сады.

Ёсць вельмі цікавая прапанова па стварэнні МТФ на беларускі ўзор. Вопыт беларусаў па вытворчасці малака і прадуктаў яго перапрацоўкі вельмі патрэбен Малдове. Здавалася б, у нас ёсць сваё малако, а вось прадукцыю «Савушкіна прадукта», нават нягледзячы на яе больш высокі кошт, малдаване набываюць ахвотней.

Шмат новых сумесных распрацовак вядуць і нашы тэхнапаркі. Іх ноу-хау яшчэ прынясуць свой плён.

***— У беларусаў таксама на слыху малдаўская прадукцыя — на гандлёвых прылаўках усю восень удосталь сакавітага вінаграду, духмяных яблыкаў...***

— Нядаўна быў на вашай знакамітай Камароўцы. У гандляроў пытаюся, адкуль вінаград. Адзін, другі, трэці кажуць: малдаўскі. Бачу, да іх прыладзіўся яшчэ адзін прадавец, і той, вокам ні міргнуўшы, пацвярджае: малдаўскі. Не стаў яго расчароўваць: кішміш у Малдове не расце. Прызнаюся, было прыемна за сваю зямлю, якая родзіць смакату, знаную ў свеце.

***— Раскажыце, як Вам удалося ў гэтым годзе ўпершыню ў Беларусі правесці фестываль малдаўскага віна?***

— На мой погляд, фестываль прайшоў вельмі ўдала. Такім чынам 30 верасня закрылі сезон асенніх свят у Мінску. Гэта быў фестываль з нашай нацыянальнай кухняй, з дэгустацыяй віна. Удзел у свяце бралі 10 малдаўскіх вінаробчых прадпрыемстваў. Ужо ёсць заказы на каньяк, віно. Думаю, што гэта прынясе не толькі эканамічную выгаду: людзі больш даведаюцца пра вінаробства, зразумеюць, што гэта мастацтва, якое патрабуе культуры піцця.

***— Як вядома, у найбліжэйшы час прадстаўнічая дэлегацыя з Гомеля наведае Гагаузію? Гэта будзе яшчэ адзін крок да пабрацімства і супрацоўніцтва?***

— Тэме пабрацімства сапраўды ўдзяляецца вельмі вялікая ўвага.Толькі сёлета падпісана чатыры пагадненні аб пабрацімстве на ўзроўні раёнаў. З Гомеля ў Гагаузію паедуць бізнесмены, якія маюць цікавасць да Малдовы. Дарэчы, у гэтым годзе ў Малдове праведзены два эканамічныя форумы з удзелам беларускіх партнёраў. Нашы прадстаўнікі бізнесколаў прымалі ўдзел у такіх жа форумах у Мінску і Магілёве. Дзелавыя людзі, як вядома, умеюць рухаць жыццё наперад.

**У Беларусі жыве больш за тры тысячы малдаван. Малдаўская дыяспара прыкметна вылучаецца сваёй актыўнасцю сярод іншых.**

***— Віктар Васільевіч, прыкметная і Ваша зацікаўленасць беларускімі рэгіёнамі. Чым карысныя для Вас гэтыя паездкі?***

— Перш за ўсё разуменнем таго, якія ёсць праблемы, каб шукаць шляхі іх вырашэння. Як, напрыклад, неабходнасць увядзення рэйса самалёта, які б звязаў Мінск і Кішынёў. Відавочная неразвітасць турызму паміж нашымі краінамі. Не хапае інфармацыі аб сучаснай Малдове ў Беларусі і наадварот.

Зараз вядзём пошук імён малдаван, якія загінулі ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У памяць аб іх сімвалічную капсулу з зямлёй закладзём у храме-помніку ў Мінску. Тое ж зробім і ў Малдове. Гэта наша агульная гісторыя. І яна нас яднае таксама.

**Алена СТЭЛЬМАХ**

■

■ Ва ўрадзе

# НАМ ЁСЦЬ ШТО ПРАПАНАВАЦЬ

**Беларускія прадпрыемствы размічваюць на больш цеснае супрацоўніцтва з Грузіяй. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ на сустрэчы з грузінскай дэлегацыяй на чале са старшынёй парламента Грузіі Іраклієм Кабахідзэ ў Доме ўрада.**

Андрэй Кабякоў адзначыў, што Грузія з'яўляецца важным партнёрам Беларусі ў Закаўказзі. «Наша краіна разлічвае актывізаваць двухбаковыя кантакты ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, нафтахіміі, фармацэўтыцы, гуманітарнай сферы. Шэраг вядомых беларускіх брэндаў — Мінскі трактарны завод, «Магілёўліфтмаш», МАЗ — хацелі б менш часу марнаваць на пошук надзейных партнёраў, з якімі можна гарантавана рэалізоўваць праекты. Нам важныя вашы рэкамендацыі, каб рэальна атрымаць у адносна кароткі, разумны прамежак часу максімальную аддачу», — звярнуўся да дэлегацыі прэм'ер-міністр. Кааперацыя ў такім шырокім спектры сфер паспрыяе павелічэнню тавараабароту паміж дзвюма краінамі. Беларусь і Грузія разлічваюць ужо ў хуткім часе павялічыць яго як мінімум да 200 млн долараў.

«Нам вядома, што ў Грузіі плануецца ўзвядзенне лядовай арэны, біятлоннага стадыёна, цэнтра скачкоў з трампліна алімпійскага стандарту. У Беларусі ёсць усе магчымасці, каб прапанаваць такія праекты. У нас ёсць лядовыя палацы, біятлонны комплекс у Раўбічах», — расказаў Андрэй Кабякоў. Ён прапанаваў развіваць супрацоўніцтва паміж праектнымі і будаўнічымі арганізацыямі дзвюх краін і заявіў, што Беларусь таксама гатовая падзяліцца вопытам развіцця гарадскіх тэрыторый і асобных рэгіёнаў.

У сваю чаргу Іраклій Кабахідзэ таксама выказаў зацікаўленасць у развіцці адносін паміж дзяржавамі па ўсіх напрамках і падзякаваў беларускім ратавальнікам за дапамогу сёлета ў тушэнні пажару ў Баржомскай цясніне.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Памёр Дзмітрый Хварастоўскі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аднаму з найбольш славутых расійскіх барытонаў было 55 гадоў. Хварастоўскі спяваў у найлепшых тэатрах свету: ад лонданскага Ковент-Гардэна і міланскай Ла Скала да Метрапаліт-опера ў Нью-Ёрку і Марыінскага тэатра. Адно з апошніх выступленняў у Расіі адбылося на сцэне Вялікага — і гэта быў яго першы вялікі спектакль у галоўным тэатры краіны. Праз паўгода ён павінен быў вярнуцца туды і выканаць оперу «Дон Карлас» Джузэпэ Вердзі, якога спявак называў любімым кампазітарам, але гэтаму перашкодзіла хвароба: у 2015 годзе выканаўцу дыягнаставалі пухліну галаўнога мозга...

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні родным, блізкім і калегам народнага артыста Расіі Дзмітрыя Хварастоўскага. «Гэты цудоўны, шматгранна адораны чалавек пакінуў унікальны след у гісторыі сучаснай культуры і award опернага мастацтва, заслужыў шчырае прызнанне не толькі ў Расіі, але і на сцэнах самых знакамітых тэатраў свету», — гаворыцца ў спачуванні. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі ведаюць, любяць і высока цэняць творчасць Дзмітрыя Хварастоўскага. «Заўчасны сыход гэтага чалавека, дзейнасць якога натхняла і дарыла выключна станоўчыя эмоцыі, — незаменная страта для ўсіх нас», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.**

## Ліванскі прэм'ер Харыры перадумаў ісці ў адстаўку

Прэм'ер-міністр Лівана Саад Харыры прыбыў у сталіцу Лівана горад Бейрут упершыню пасля сваёй задаўнёнай паездкі ў Саудаўскую Аравію, якая абярнулася палітычным крызісам у яго на радзіме. Проста з аэрапорта палітык адправіўся памаліцца на магілу свайго бацькі Рафіка аль-Харыры, забітага ў 2005 годзе. Харыры прыме ўдзел у святкаванні Дня незалежнасці Лівана. Пры гэтым ён перадумаў пакідаць сваю пасаду пасля сустрэчы з прэзідэнтам краіны, перадае тэлеканал Al-Mayadeen. «Я падаў заяву аб адстаўцы прэзідэнту рэспублікі (Мішэлю Ауну. — РЭД.). Ён папрасіў мяне пачакаць, я пагадзіўся і адклаў адстаўку», — цытуе канал заяву Харыры. Харыры таксама заявіў, што гатовы да грунтоўнага дыялогу і супрацоўніцтва з прэзідэнтам для вырашэння шэрагу рознагалоссяў.



## Польшча падпісала пяцігадовы кантракт на пастаўку звадкаванага газу з ЗША

Польская энергетычная дзяржкампанія PGNiG паведаміла аб заключэнні дагавора з брытанскім трэйдарам Centrica LNG аб пастаўках звадкаванага прыроднага газу з ЗША. Гэта першы сярэднетэрміновы кантракт з ЗША ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Газ прызначаецца для рынку Польшчы і іншых краін Цэнтральнай Еўропы, заключаны кантракт — першы з некалькіх запланаваных. Пагадненне заключана ў рамках стратэгіі PGNiG па забеспячэнні надзейных і разнастайных паставак газу ў Польшчу і яе гандлёвых магчымасцяў на еўрапейскім рынку. Такім чынам будзе павышана энергетычная бяспека рэгіёна, у якім «гістарычна дамінаваў расійскі газ», сказана ў паведамленні польскага канцэрна.


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БРЕСТСКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ БЕЛОРУССКОЙ ЖЕЛЕЗНОЙ ДОРОГИ»**

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Общая площадь, кв. м | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ №1. Участок тротуара из мелкоштучной бетонной плитки, площадью 27990 кв. м, относящийся к капитальному строению (инв. №130/С-30826), вокзал станции Пинск, по адресу: Брестская обл, г. Пинск, ул. Железнодорожная, 19 | 22,80 | 2,28 | 6,00 | – | Для размещения объекта выносной торговли продовольственными и непродовольственными товарами, за исключением взрывоопасных, легковоспламеняющихся, алкогольной продукции, табачных изделий |
| Срок договора аренды не менее трех лет | | | | | |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов в течение 5 рабочих дней будет заключен договор аренды имущества;<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка;<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал<br>р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция №100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | | | |

**Аукцион состоится 27 декабря 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81

Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. №624, от 23.09.2011 г. №431, от 10.01.2013 г. №14), – 10 базовых величин

**Последний день приема заявлений – 26 декабря 2017 г. до 17.00**

■ Фестывалім!

# СУСВЕТНАЯ СТАЛІЦА ДЖАЗА

## Мінск — месца музыкі і сапраўднага драйву

**Сёння ўвечары ўрачыстым канцэртам у Палацы прафсаюзаў адкрываецца XVI Міжнародны фестываль «JazzinMinsk-2017». Шматлікія замежныя джазавыя зоркі сусветнага ўзроўню ці не ўпершыню выступяць разам на адной сцэне. Самым вядомым дуэтам будуць уладальнікі прэміі «Jazz Awards» вакалістка Марджоры Барс з ЗША і саксафаніст Рэй Блу з ЗША. Як адзначаюць арганізатары, многія замежныя госці спецыяльна едуць у нашу краіну, каб убачыць цікавінкі, якія будуць адбывацца на мінскай джазавай сцэне.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Маэстра беларускага джаза Яўген УЛАДЗІМІРАЎ *(справа)* з кіраўніком адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска Ігарам БУЗОЎСКІМ.

— У Мінску джаз быў яшчэ напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. У 1939 годзе сюды завітаў Эдзі Рознэр і пасеяў добрае насенне ў нашай філармоніі, — адзначае **старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір КАРАГІН.** — Джаз развіваўся ў нас і ў апошнія гады, узнікалі цудоўныя калектывы, яны раз'язджаліся па свеце, вярталіся назад у Мінск. Але галоўнае, што была выхавана адчувальная да музычнай культуры публіка. Калі прыязджаюць замежныя госці, яны здзіўляюцца музыкальнасці беларусаў: класічная музыка, фальклор, традыцыі... Але джаз — гэта асаблівы від мастацтва. Нездарма гэта прызнала ЮНЕСКА і нават адзначыла Яўгенія Уладзімірава ў адпаведнай намінацыі. Таму мы і задумалі зрабіць Мінск сталіцай сусветнага джаза.



Уладзімір КАРАГІН.

Фестываль будзе праходзіць на працягу чатырох дзён. З раскладам канцэртаў можна азнаёміцца на сайце jazzclub.by — зрэшты, большасць білетаў ужо прададзеная. Затое рэгулярна праходзяць канцэрты ў джаз-клубе ў Палацы Рэспублікі — пры жаданні да джазавай культуры можна далучыцца там.

**Кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска Ігар БУЗОЎСКІ** заўважае:

— Наша краіна сёння дэманструе адкрытасць, імкненне да пошуку новых формаў, развіцця не толькі ў сферы эканомікі, палітыкі, але і мастацтва, у тым ліку і джаза. Выканаўцы, якія прыязджаюць на фестываль, трымаюць надзвычай высокую планку майстэрства. Датычнасць да гэтай справы дае нам пэўныя прэферэнцыі. Гэта ўплывае на нашы думкі, наражае імкненне развіваць свой горад і фарміраваць культуру.

Для студэнтаў у галерэі «Універсітэт культуры» ў Палацы Рэспублікі будуць праходзіць бясплатныя майстар-класы замежных зорак і айчынных прафесіяналаў. Такое адбываецца не ўпершыню — і ўжо відаць прафесійны рост моладзі. Гэта выдатны падарунак і матывацыя да далейшага творчага росту.

— Я памятаю, што пазнаёміўся з джазам, калі мне было шэсць гадоў. Тады я прыехаў у летнік «Стайкі» і пабачыў расцяжку «Пiянер — скажы джазу «не». А сёння джаз гучыць у самым цэнтры Мінска! Каб паслухаць яго, дастаткова прыйсці ў Палац прафсаюзаў у канцэртную залу ці завітаць у джаз-клуб у Палацы Рэспублікі, — як заўсёды эмацыянальна кажа **генеральны прадзюсар фестывалю «JazzinMinsk» Яўген УЛАДЗІМІРАЎ.** — Мы ганарымся, што да нас на фестываль сёлета прыязджае «дзед» — так, вы ўсё правільна пачулі! Хлапцу — 90, а з кожным годам у яго з'яўляецца ўсё больш драйву! У джазавай музыцы чым старэйшы музыкант, тым больш у ім «соку». Ноіл Скот да таго ж і апранаецца як піжон. Амаль пасля кожнай песні ён мяняе адзенне. Спецыяльна з Нью-Ёрка для яго прывозяць цэлы куфэрак з вопраткай!..

На фестывалі будзе больш за 50 удзельнікаў. Яны завітаюць не толькі з Амерыкі, але і з Англіі, Італіі, Францыі, Германіі, Расіі. Што да беларускіх удзельнікаў, то акрамя Яўгена Уладзімірава на вялікай сцэне можна будзе ўбачыць і пачуць калектыў «JazzinMinsk», піяніста Сяргея Аляксандрава, кантрабасіста і бас-гітарыста Уладзіміра Бялова.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

■ Падпіска-2018

# СТАЛІЦА ВЫБІРАЕ «ЗВЯЗДУ»

**Падпісная кампанія на першае паўгоддзе 2018-га паціху набірае абароты. Прынамсі, аформіць падпіску на любімую «Звязду», каб атрымліваць нашу газету і налета, можна неадкладна, каб не забыць пра гэта ў чарадзе святочных пераднавагодніх клопатаў. Што, дарэчы, пэўная колькасць падпісчыкаў ужо паспела зрабіць.**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Любяць і чытаюць «Звязду» ў Мінску. У гэтым давялося чарговы раз пераканацца. У прыватнасці, актыўна падтрымліваюць найстарэйшую беларускую газету ў Савецкім раёне сталіцы. Тут багата як індывідуальных, так і ведамасных падпісчыкаў. Як заўважыла **намеснік кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна Аксана ВОЛКАВА,** сродкі масавай інфармацыі адыгрываюць вялікую ролю ў паступальным сацыяльна-эканамічным развіцці раёнаў.

І мы імкнёмся адпавядаць такой адзнацы. Пісаць для людзей і пра людзей. І дзякаваць сваім адданым падпісчыкам. Дарэчы, сярод найлепшых у Савецкім раёне па арганізацыі падпіскі на «Звязду» — філіял «Мінсктранса» — аўтобусны парк №7. Такое плённае супрацоўніцтва насамрэч сімвалічнае, паколькі работнікі аўтапарка, як і журналісты, заўжды ў дарозе. Таму адзначыць адданасць гэтага прадпрыемства менавіта нашаму выданню было асабліва прыемна. **Намеснік дырэктара аўтобуснага парка №7 Ірына Філіповіч** атрымала дыплом газеты і адметныя звяздоўскія падарункі. І віншаванні... з Новым годам (у сталіцы ўсё больш святочнай сімволікі, не выключэнне і будынак адміністрацыі Савецкага раёна). Вельмі спадзяёмся, што і налета застанёмся разам!

**(Ул. інф.)**

## Без бюракратызму і толькі па справах

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца ў суботу, 25 лістапада, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. Улады будуць адказваць на пытанні жыхароў краіны з 9.00 да 12.00. На сувязь выйдуць:**

старшыня БРЭСЦКАГА аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 275 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч ХАРЫТОНЧЫК. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ Пазіцыя

## Кіеў зрабіў «недружалюбны крок»

**Міністэрства замежных спраў нашай краіны расцаніла рашэнне ўкраінскага боку аб высылцы дыпламата Пасольства Рэспублікі Беларусь ва Украіне як «цалкам беспадстаўнае».**

Адказваючы на пытанне карэспандэнта партала «TUT.by», намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі МЗС Беларусі Андрэй ШУПЛЯК заявіў:

— Расцэньваем рашэнне ўкраінскага боку аб высылцы дыпламата Пасольства Беларусі ва Украіне як абсалютна беспадстаўнае. Выказваем шкадаванне ў сувязі з гэтым недружалюбным крокам Кіева.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ТОЛЬКІ ДЛЯ ЖАНЧЫН

### Гуманітарны праект па ранніем выяўленні раку шыйкі маткі стартаваў на Гомельшчыне

**Пагадненне аб яго рэалізацыі падпісалі старшыня Беларускага саюза жанчын Мар'яна Шчоткіна, прэзідэнт праектнай камісіі «Ротары клуб Ада Ладыджана» (Італія) Джузэпэ Нікалеці, старшыня грамадскага аб'яднання «Ротары клуб «Новая Ратуша» (Беларусь) Юрый Цвірко і дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека Аляксандр Ражко.**

Рак шыйкі маткі з'яўляецца актуальнай праблемай для беларускіх жанчын ва ўзросце ад 35 да 65 гадоў. Штогод колькасць упершыню выяўленых выпадкаў прырастае. Ранняя дыягностыка гэтага віду раку ажыццяўляецца з дапамогай скрынінгу дадзенай узроставай групы. У межах праекта спецыялісты РНПЦ радыяцыйнай медыцыны плануюць абследаваць на працягу трох гадоў каля 14 тысяч жанчын у некалькіх раёнах Гомельшчыны (раёны пакуль вызначаюцца). Італьянскі «Ротары клуб» выдзеліць для такой мэты тры спецыяльныя прыборы — кальпаскопы, а таксама расходныя матэрыялы. Старшыня БСЖ Мар'яна Шчоткіна выказала надзею на тое, што супрацоўніцтва паміж бакамі ў галіне ўмацавання здароўя беларускага насельніцтва працягнецца ў іншых праектах.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## Загадкі, славутасці, народная культура

**Такім кнігам, як «Дзіцячы атлас Беларусі», толькі што выдадзены ў «Мастацкай літаратуры», нельга не парадавацца. Аўтар тэксту, укладальнік Паліна Грынчанка зрабіла, здаецца, немагчымае — яна паспрабавала адказаць на сотні пытанняў, што задаюць дзеці ва ўзросце ад двух да дзесяці гадоў.**




Якая самая вялікая кветка расце ў Беларусі? Хто жыве ў норцы? А ці можа дыхаць жаба пад вадой? Я хачу вывучаць жывёл, як будзе называцца мая прафесія? Што такое варган? Дзе ў Беларусі можна знайсці скарбы? Самыя неймаверныя факты, яркія ілюстрацыі (арыгінал-макет выдання належыць кніжнаму графіку і дызайнеру кнігі Уладзіміру Жуку) сабраны пад адной вокладкай выдання, выпуск якога ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Шкада, што тыраж у кнігі ўсяго толькі 1500 асобнікаў. Такі «Дзіцячы атлас Беларусі» можна смела пакаваць кожнаму з самых юных грамадзян краіны. Нават калі яны яшчэ зусім не ўмеюць чытаць.

Лаканічныя тэксты пра Тураўскія крыжы, курганы нашай Айчыны, мора Герадота, крыж Еўфрасінні Полацкай, пра скарбы Напалеона, легендарнае балота Ельня, пра фантастычную істоту Цмока — для многіх яны стануць яшчэ і першым у жыцці ўрокам радзімазнаўства, урокам развіцця пачуцця цікаўнасці да роднага, да таго, што ядная сярэднявечча і сучаснасць. Згаданыя абсягі чытач адкрые ў раздзеле «Сем загадак Беларусі». А ўвогуле ў «Дзіцячым атласе Беларусі» нас чакаюць сустрэчы са звярамі і птушкамі, насякомымі і павукамі, жыхарамі вадаёмаў, раслінамі, грыбамі. Чакае падарожжа па абсягах народнай культуры, знаёмства з архітэктурнымі і гістарычнымі славутасцямі.

Добра было б, каб кнігу, прыдуманую і выкананую ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», заўважылі ў Міністэрстве адукацыі краіны і паралелі звярнуць на яе ўвагу складальнікам праграм пазакласнага чытання. Паверце, «Дзіцячы атлас Беларусі» варты таго.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# «ДАСТАТКОВА ЗРАБІЦЬ ЗВАНОК...»

## ВАЛАНЦЁР СТАНОВІЦЦА «ВАЧЫМА»

Адна з такіх магчымасцяў — якраз-такі мабільная праграма «Штурман», створаная распрацоўшчыкамі нашай айчыннай кампаніі «Белхард Дэвелапмент» спецыяльна для невідушчых і слабавідушчых людзей. Ідэя ў тым, што валанцёр дыстанцыйна становіцца на нейкі час «вачыма» невідушчага чалавека. Каб атрымаць дапамогу, трэба бясплатна спампаваць на свой смартфон мабільную праграму. Пасля гэтага чалавек у любы момант можа патэлефанаваць па мабільным тэлефоне, і праграма выбярэ сярод валанцёраў тых, хто цяпер даступны. Першы з іх, хто падняў трубку, і стане павадыром, або, як называюць яго распрацоўшчыкі, «штурманам».

Дзякуючы відэакамеры смартфона «штурман» у рэжыме рэальнага часу бачыць усё, што акружае невідушчага, і дае яму неабходныя парады. Ён можа дапамагчы прайсці па вуліцы, назваць нумар аўтобуса, што падышоў да прыпынку, зняць паказанні лічыльнікаў і многае іншае. Напрыклад, збіраецца чалавек гатаваць салату, а ў яго дзве аднолькавыя банкі стаяць: зялёны гарошак і салодкая кукуруза. Якую адкрываць, як даведацца? Тэлефануе — і «штурман» прыходзіць на дапамогу.

**Праект дае здаровым людзям магчымасць зрабіць добрую справу, дапамагчы іншаму тут і цяпер. Гэта нармальнае жаданне любога здаровага, адэкватнага чалавека.**

Пасля завяршэння званка невідушчы чалавек можа ацаніць «штурмана», які працаваў з ім. І калі ён пакіне негатыўны водгук, такога чалавека могуць заблакіраваць, і ён больш не будзе ўдзельнічаць у праекце.

Дарэчы, з дапамогай праграмы можна не толькі здымаць відэа — ёсць і дадатковыя функцыі. Напрыклад, можна зрабіць фатаграфію. Калі «штурману» складана разабрацца нешта, дапусцім нейкія лічбы, ён можа дыстанцыйна сфатаграфаваць іх і ўжо на сваім тэлефоне павялічыць фота, каб прачытаць свайму падапечнаму. «Штурман» можа



дыстанцыйна вызначыць геалакацыю, гэта значыць месца, дзе зараз знаходзіцца невідушчы чалавек, каб дапамагчы яму зарыентавацца. Калі цёмна, ён можа дыстанцыйна ўключыць са свайго тэлефона ліхтарык на тэлефоне невідушчага.

А калі чалавек з праблемамі са зрокам захоча, каб яго званок ішоў на кагосьці канкрэтнага, каго ён ведае асабіста, дапусцім сваяка ці сябра, ён можа стварыць у праграме спіс асобных кантактаў, і званок будзе паступаць толькі на гэтую групу. Ужо цяпер ёсць падобны прыклад: пажылы бацька, які слаба бачыць, жыве ў Оршы, а яго сын — у Мінску. Абодва спампавалі гэту праграму і маюць даступную і бясплатную відэасувязь «тут і цяпер». Сын у любую хвіліну можа дапамагчы зарыентавацца свайму блізкаму чалавеку.

## НІ АДЗІН ЗВАРОТ НЕ ЗАСТАЕЦЦА БЕЗ АДКАЗУ

34-гадовая Вольга Шпакава з Віцебска зарэгістравалася ў гэтай праграме ў якасці валанцёра яшчэ ў чэрвені. Рэальна дапамагаць пачала з верасня, як толькі ў яе з'явіўся андроід. «Ёсць невідушчы знаёмы, ад яго і даведалася пра гэту праграму», — кажа маладая жанчына. Учора, напрыклад, яна дапамагла дзяўчыне Маргарыце з Магілёва.

— Паступіў званок, я зняла трубку і спытала, якая дапамога патрэбна, — кажа Вольга. — Дзяўчына папрасіла дапамагчы зарыентавацца і апісала, які будынак ёй патрэбен. Маршрут яна ў асноўным ведала, арыентавалася на мясцовасці таксама добра. Я толькі накіроўвала яе направа-налева, каб пазбегнуць няроўнасцяў на асфальце, слупоў. Дапамагла не ўрэзацца ў агароджу... Са мной яна, вядома, адчувала сябе больш упэўнена. Пераходзіла і дарогу, але на пешаходным пераходзе, які спецыяльна абсталяваны для невідушчых, з гукавым сігналам. Мы «ішлі» разам з ёй хвілін сем. Потым яна патэлефанавала і папрасіла «правесці» яе назад, дадому.

Вольга кажа, што часам людзі просяць прачытаць які-небудзь тэкст або назву лекаў, дапамагчы прайсці да крамы...

— Ні адзін званок не застаецца без адказу, — сцвярджае **каардынатар праекта Анастасія СУХАВАРАВА**. — Часта хтосьці са штурманаў-добраахвотнікаў падымае трубку ў першыя ж секунды. І мы яшчэ не атрымалі ніводнага негатыўнага водгуку ад невідушчых людзей.

Дадзены праект быў запушчаны ў канцы вясны — пачатку лета. Ён з'яўляецца сацыяльным: праграма цалкам бясплатная для карыстальнікаў, і ўсе тры беларускія аператары мабільнай сувязі выдзяляюць для яго бясплатны інтэрнэт-трафік. На цяперашні момант у ім зарэгістравана каля тысячы людзей. Гэта не толькі мінчане і нават не толькі беларусы, а таксама жыхары Расіі, Казахстана, Эстоніі, Грузіі...

Па словах Анастасіі Сухаваравай, сярод карыстальнікаў — прыблізна палова невідушчых і палова «штурманаў». Прычым людзі з нармальным зрокам, якія хочуць дапамагчы, падключаюцца нават больш актыўна, чым невідушчыя. Праект дае здаровым людзям магчымасць зрабіць добрую справу, дапамагчы іншаму тут і цяпер. Гэта нармальнае жаданне любога здаровага, адэкватнага чалавека. Добрыя справы натхняюць, пачынаеш сам сябе больш паважаць...

**Збіраецца чалавек гатаваць салату, а ў яго дзве аднолькавыя банкі стаяць: зялёны гарошак і салодкая кукуруза. Якую адкрываць, як даведацца?**

Але зараз галоўнае — каб гэтай праграмай пачалі карыстацца невідушчыя і тыя, хто слаба бачыць, кажа Анастасія Сухаварава. Дзесьці 70% людзей з сур'ёзнымі праблемамі зроку складаюць пажылыя людзі. І многія з іх баяцца сучасных тэхналогій. Да таго ж не ва ўсіх невідушчых ёсць смартфон, а мабільная праграма працуе толькі на такой прыладзе. Але сёння смартфон каштуе зусім не велізарныя грошы, яго кошт на парадак ніжэйшы, чым кошт сабакі-павадыра.

Спампаваць «Штурмана» і разабрацца ў ім зусім нескладана. Калі чалавек не можа зрабіць гэта сам — дапаможа сын, унук або любы школьнік. Галоўнае — не баяцца зрабіць хоць бы маленькі крок, таму што пад ляжачы камень вада не цячэ. Некаторыя любяць скардзіцца на тое, як усё дрэнна і няма магчымасцяў. На самай справе магчымасці ёсць, трэба толькі працягнуць руку.

Вы зробіце званок — і хтосьці абавязкова вам адкажа. Гэты «хтосьці» можа жыць у Мінску, Разані або ў Тбілісі, — але ўсё роўна дзякуючы «Штурману» ён зможа вам дапамагчы. Пры жаданні вы нават зможаце перакінуцца з чалавекам парай слоў, даведацца з першых вуснаў, якое надвор'е зараз у Грузіі ці Маскве... Магчыма, вы яшчэ некалькі дзён пасля будзеце ўсміхацца, успамінаючы невялічкую размову з незнаёмцам, які адгукнуўся і дапамог вам. А ён будзе ўсміхацца, успамінаючы вас...

***P.S.** Дарэчы, у найбліжэйшы час «Штурман» будзе ўдасканалены. Дзякуючы супрацоўніцтву з Мінтрансам невідушчы альбо слабавідушчы чалавек, які спампаваў праграму, зможа, стоячы на аўтобусным прыпынку, запытаць праз яго расклад транспарту, каб даведацца, які аўтобус зараз прыбудзе, і выбраць той, што яму патрэбны. Пры гэтым кіроўцу абранага чалавекам аўтобуса прыйдзе сігнал, што на прыпынку будзе садзіцца невідушчы і трэба пад'ехаць проста да пачатковага слупа, каб той мог без праблем увайсці ў салон...*

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У тэму

**У сталіцы невідушчых навучаць карыстацца мабільнымі праграмамі**

**У Заводскім раёне Мінска найбліжэйшым часам будзе арганізавана навучанне невідушчых людзей карыстанню смартфонамі, планшэтамі і мабільнымі праграмамі. Гэты праект будзе рэалізаваны дзякуючы дзяржаўнаму сацыяльнаму заказу.**

Невідушчых мінчан пазнаёмяць з асновамі камп'ютарнай адукаванасці без зрокавага кантролю з дапамогай праграм экраннага доступу. Дарэчы, з ліпеня гэтага года такім навучаннем ужо скарысталіся 45 чалавек, якія пражываюць у Фрунзенскім раёне сталіцы.

# ЦЭНЫ НА ЖЫЛЛЁ ПАЛЕЗЛІ ЎГОРУ?

## Было сем, стала шэсць

Рост коштаў на другасным рынку зменшыў ход, але пакуль не спыняецца. Толькі за тыдзень індэкс коштаў на кватэры ў Мінску вырас на 0,3%. Да максімальнага значэння ў 2017 годзе індэксу засталося падняцца ўсяго на 4 долары, а да максімальнага значэння мінулай восені засталося 23 долары.

Новабудоўлі чарговы раз практычна зраўняліся з другасным рынкам па сярэднім узроўні цэн. Сярэдняя цана кватэр у новабудоўлях Мінска вырасла за апошні тыдзень на 0,4% і складае цяпер 1188 долараў за квадратны метр. За 4,5 месяца квадратны метр на першасным рынку падаражэў у сярэднім на 70 долараў.

Аб'ём прапановы на другасным рынку жылля, па даных партала realt.by, працягвае скарачацца. Прапанова кватэр на другасным рынку за 11 тыдняў скарацілася з 7 да 6 тысяч кватэр, аднак «прабіць» гэтую круглую адзнаку з першага разу не атрымалася — па выніках тыдня кватэр на другасным рынку стала больш на 0,2%. Рост быў дасягнуты за кошт двух- і трохпакаёвых кватэр, дзе прапанова вырасла на 0,3% і 0,8% адпаведна.

Працягваюць актыўна вымывацца з базы аднапакаёвыя кватэры (-0,9% за тыдзень). Таксама скарацілася колькасць чатырохпакаёвых кватэр (-0,2%). Па стане на 20 лістапада ў базе даных пакупнікам прапануецца 6039 кватэр. Структура прапановы па тыпах кватэр сёння выглядае наступным чынам. Двухпакаёвых кватэр прапануецца 33,7%, потым трохпакаёвыя — 33,4%, аднапакаёвыя — 22,1%, чатырохпакаёвыя — 10,8%.

А ўвогуле прапанова кватэр скарачаецца ўжо сем месяцаў, за гэты час выбар зменшыўся на 22%.

## Прадаўцы гатовыя на зніжкі, зараз — невялікія

Вымыванне сапраўды танных аб'ектаў жыллёвай нерухомасці з рынка другаснага жылля прыводзіць да аўтаматычнага росту сярэдніх цэннікаў. Але гэтая тэхнічная навіна не паўплывае на тэндэнцыі паводзін пакупнікоў і прадаўцоў. Пры рэальных здзелках улаcнікі жылля згаджаюцца на істотныя зніжкі. Напрыклад, аднапакаёвыя кватэры прапануюцца па цане 1242 долары за квадратны метр, а рэальна прадаюцца за 1168 долараў. Двухпакаёвыя кватэры адпаведна прапануюцца за 1181 долар за «квадрат», а аддаюцца за 1100 долараў. Трохпакаёвыя кватэры прапануюцца за 1145 долараў, а прадаюцца за 990 долараў.

Рост сярэдняй цаны прапановы адзначаны ва ўсіх раёнах Мінска, акрамя Цэнтральнага. Найбольшы рост за мінулы месяц адбыўся ў Ленінскім раёне — 2,23%. У Цэнтральным раёне сярэдняя цана нават знізілася на 0,5%.

Самы дарагі раён Мінска — Цэнтральны — з сярэдняй цаной прапановы 1392 долары за квадратны метр. Калі параўнаць цэны на кватэры ў Цэнтральным раёне і самым танным — Заводскім (кошт «квадрата» — 1057 долараў), то атрымліваецца, што кватэры ў Цэнтральным раёне даражэйшыя на 25—30%. Лідарам па колькасці аб'ектаў жыллёвай нерухомасці, якія выстаўляюцца на продаж, з'яўляецца Фрунзенскі раён — 23% ад усёй прапановы.

Розніца паміж цаной прапановы і цаной рэальных здзелак — каля 5%, што з'яўляецца найменшым паказчыкам апошніх гадоў.

## Мінімальныя цэны ўжо за 30 тысяч

Цэны на аднапакаёвыя кватэры ў Мінску пачынаюцца ад 32 тысяч долараў. Праўда, такая нерухомасць больш нагадвае маласемейнае жыллё з сумешчаным прыбіральняй і маленькай кухняй. Стандартную аднапакаёвую кватэру плошчай 33 квадратныя метры можна набыць за 37—38 тысяч долараў. У параўнанні з мінулым месяцам цэны на аднапакаёвыя кватэры выраслі на 1—2 тысячы долараў.

Цэны на двухпакаёвыя кватэры ў Мінску пачынаюцца ад 37 тысяч долараў. Аднак стандартныя двухпакаёвыя кватэры агульнай плошчай 48 метраў прапануюцца па цане 52—54 тысячы долараў. Цэны на гэта жыллё падраслі на 2—3 тысячы долараў. Самую танную трохпакаёвую кватэру можна набыць за 47 тысяч. Сярэдні дыяпазон цэн на стандартныя трохпакаёвыя кватэры ў Мінску плошчай 63 квадратныя метры — 65—68 тысяч долараў. За апошні месяц цэны тут выраслі нязначна.

## Танней усяго — у Віцебску

Сярэдняя цана прапановы квадратнага метра ў абласных гарадах Беларусі, па даных партала realt.by, выглядае наступным чынам. Самая дарагая жыллёвая нерухомасць выстаўлена на продаж у горадзе над Бугам. У Брэсце прапануюцца апартаменты за 724 долары за квадратны метр. Другім у гэтым спісе — Гродна, дзе за «квадрат» просяць 692 долары. Потым ідзе Магілёў — 588 долараў, Гомель — 567 долараў і Віцебск — 560 долараў за квадратны метр.

Для параўнання прывядзём сярэднія цэны на нерухомасць у Маскве і Кіеве. У гэтых суседніх рэгіёнах цэны працягваюць падаць. Сярэдняя цана на другасным рынку жыллёвай нерухомасці Масквы за мінулы тыдзень апусцілася на 0,5% і складае 2821 долар за квадратны метр. Інфармацыя падрыхтавана па даных партала irn.ru. У Кіеве сярэдняя цана на другасным рынку за тыдзень знізілася на 0,1% і складае 1476 долараў за «квадрат». Сярэдняя цана кватэр на першасным рынку сталіцы Украіны ў доларавым эквіваленце знізілася на 0,4% і складае 814 долараў за квадратны метр.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У тэму

Сёлета за перыяд са студзеня па кастрычнік арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана ў Беларусі 34,8 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 3 млн 50,6 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1005,8 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 33% ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля.

З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, пабудавана: з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі — 468,4 тысячы квадратных метраў, у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 530,9 тысячы квадратных метраў. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 887,9 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, або 29,1% ад агульнага ўводу па краіне.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

23 ЛІСТАПАДА 2017 г.
ЧАЦВЕР
№22 (15829)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны



# Ілья ЛУКАВЕЦ:
# «Не лічу гадзін, праведзеных у зале»

**Навапалачанін Ілья Лукавец — адзін з самых вядомых бодзібілдараў краіны. Абсалютны чэмпіён Беларусі, шматразовы пераможца і прызёр розных турніраў гэтай восенню дадаў у сваю скарбонку яшчэ адзін тытул — стаў абсалютным чэмпіёнам Расіі. Пры гэтым Ілья працуе ратавальнікам, ён прапаршчык унутранай службы пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада і выхоўвае дзвюх паўгадовых дачок. У сваім інтэрв'ю спартсмен расказаў аб заваяваных тытулах, каштоўнасці кубкаў і медалёў, а таксама падзяліўся меркаваннем пра тое, ці лёгка вялікаму чалавеку знайсці адзенне патрэбнага памеру ў беларускіх крамах.**

***— Ілья, для пачатку раскажыце пра сваю нядаўнюю перамогу на чэмпіянаце Расіі.***

— У Астрахані сабраліся вельмі моцныя хлопцы, наогул, у гэтым сезоне ў маёй катэгорыі высокая канкурэнцыя. Было шмат удзельнікаў, у асноўным гэта расіяне, а таксама спартсмены з Беларусі, Казахстана, Ірана, Украіны. Падрыхтоўку да асенняга сезона пачаў са снежня, у верасні быў ужо задаволены сваёй формай, думаю, лепш у фізічным плане я сябе яшчэ не адчуваў. Рыхтаваўся пад кіраўніцтвам вопытных трэнераў — Юрыя Мялешкі і Фідэля Сядых.

Да гэтага часу не да канца разумею, што змог перамагчы на чэмпіянаце Расіі, але сказаць, што ўва мне штосьці змянілася, перавярнулася, таксама не магу. Настройваюся на далейшую працу, стаўлю перад сабой новыя мэты. Для мяне заўсёды самае галоўнае — паказаць сваю лепшую форму, свой прагрэс, а пра месца на п'едэстале думаеш ужо потым. Таму лічу, што няма ніякай каштоўнасці ў медалях і кубках. Дарэчы, у мяне дома — ні адной узнагароды, усе яны знаходзяцца ў зале ці ў трэнера.

***— Наогул цяперашні сезон складваецца для вас удала?***

— Так, у мяне было тры турніры акрамя чэмпіянату Расіі. У верасні ўдзельнічаў у Кубку Піцера, дзе стаў трэцім, гэта быў толькі пачатак сезона, таму форма яшчэ не дайшла да свайго піку. Потым выйграў Кубак Беларусі, стаў найлепшым у суперцяжкай і абсалютнай катэгорыях. Таксама нядаўна ў Маскве ўдзельнічаў у буйным турніры, дзе выйграў у суперцяжкай катэгорыі.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Цікавы досвед

# ПАМІЖ «ЛАЙКАМІ» І РЭАЛЬНАСЦЮ

### Як на школьных уроках вучаць арыентавацца ў медыясвеце?



**«Падрастаючае пакаленне атрымлівае сёння інфармацыю пераважна з інтэрнэту, прычым у найбольшай ступені падлеткі схільны давяраць сваім сябрам, а гэта значыць, што яны атрымліваюць той блок навін штодня, які «фрэнды» перапасцілі ў сваёй стужцы ў сацыяльных сетках. Так фарміруецца іх бачанне свету. І гэта стала праблемай для традыцыйных СМІ, — лічыць Ян ЙІРАК, прафесар Інстытута камунікацыі і журналістыкі факультэта сацыяльных навук Карлавага ўніверсітэта. — Звычайна самыя важныя навіны ідуць у інфармацыйным блоку на тэлебачанні першымі, а ў газетах для іх адводзіцца першая паласа. Але што мы назіраем у сацыяльных сетках? Там на першы план выходзіць тое паведамленне, якое часцей за ўсё перапошчваецца. Яно разлятаецца па сеціве і становіцца найбольш важным. Таму даводзіцца канстатаваць, што традыцыйныя СМІ страцілі інструменты ўплыву на аўдыторыю. Ім вельмі праблематычна прыцягнуць увагу да сапраўды важных падзей».**

## КАЛІ «ГУРУ» — ВІДЭАБЛОГЕРЫ

Ян Йірак — адзін са стваральнікаў канцэпцыі медыяадукацыі ў Чэхіі. Пачынаючы з 2006 года медыяадукацыя ўключана ў абавязковую вучэбную праграму ўсіх базавых школ і гімназій (з трэцяга года навучання). Кожная школа сама вырашае, як яна будзе рэалізоўваць медыяадукацыю: як асобны прадмет або як скразную тэму ў рамках розных прадметаў ці камбінаваць першае і другое.

— Дзеці ў сацыяльных сетках сутыкаюцца, як правіла, толькі з тымі, хто падзяляе іх думкі, і амаль не перасякаюцца з людзьмі, якія маюць іншае меркаванне. Псіхолагі ўжо звярнулі ўвагу на тую акалічнасць, што расце пакаленне людзей, якім складана будзе ісці на кампраміс. Яны выхаваныя на тых пастах у Фэйсбуку, якія са сваімі сябрамі ўзаемна лайкалі, — падкрэслівае прафесар. — Для дзяцей ва ўзросце 10—11 гадоў самыя вялікія аўтарытэты — гэта відэаблогеры на YouTube, з якімі яны сябе атаясамліваюць. Увогуле, канцэпцыя медыядукацыі распрацоўвалася ў Чэхіі яшчэ ў пачатку двухтысячных гадоў, да з'яўлення Фэйсбуку і іншых сацыяльных сетак. Але свет імкліва змяніўся. Дзеці сёння не чытаюць газет, а многія не глядзяць і тэлебачанне ці робяць гэта анлайн (зноў-такі ў інтэрнэце). Таму змест медыяадукацыі трэба пастаянна актуалізаваць. Яе задача — сфарміраваць крытычнае стаўленне да ўсіх медыя. Каб яны разумелі, на якіх прынцыпах заснаваны рух той ці іншай інфармацыі ў сацыяльных медыя, як на іх уплывае аўдыякантэнт і відэакантэнт, уздзейнічае рэклама.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Пара на парах

# «ГАЛОЎНАЕ — ШУКАЦЬ КАМПРАМІСЫ»

### Студэнцкая сям'я — пра жыццё ў інтэрнаце, агульны бюджэт і планы на будучыню

**З кожным годам беларусы ўступаюць у шлюб усё пазней. Вырашаюць спачатку наладзіць жыццё: адукацыя, кар'ера, вандроўкі... Але ўсё разлічыць немагчыма, асабліва што датычыцца спраў сардэчных. Тым больш, як у той прымаўцы, з мілым рай і ў шалашы. Ці ў інтэрнаце. Студэнцкая сям'я БАБАК расказала, як яны дзеляць дамашнія абавязкі, дзе збіраюцца падпрацоўваць і хто першы ідзе мірыцца.**

## Пакой па цане праязнога

Воля і Рома вучацца на філалагічным факультэце БДУ. Яна на трэцім курсе, ён — на чацвёртым. Гэтым летам, у ліпені, пара пажанілася і атрымала сямейны пакой у інтэрнаце №3 на вуліцы Курчатава.

— Нам пашанцавала. Калі заязджалі, усё выглядала так, як і цяпер, — паказваюць яны журналістам сваё светлае і ўтульнае гняздзечка. — Былі паклеены шпалеры, стаяла мэбля: два ложкі, тумбы, стол, шафа і халадзільнік.

Па студэнцкіх мерках жыллё выдатнае, ёсць нават асобны санвузел. За пакой плацяць амаль столькі ж, колькі за праязны білет — 36 рублёў у месяц.

Будучыя філолагі родам са Светлагорска. Пазнаёміліся яшчэ да таго, як паступілі ва ўніверсітэт — разам хадзілі ў Дом культуры энергетыкаў. Воля займалася танцамі, у якасці мадэлі дэманстравала касцюмы з паперы, а Рома спяваў.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Я ўвесь час «варыўся» ў творчым асяродку: спектаклі, вакал, — успамінае хлопец. — Але бацькі сказалі: «Якая Акадэмія мастацтваў? Будзеш пасля працаваць у Доме культуры. Выберы штонебудзь больш перспектыўнае». Я якраз толькі з'ездзіў у Германію і падумаў, што хачу вучыць мовы і паспрабаваць сябе ў ролі перакладчыка. Таму і пайшоў на філолага.

Рома — адзіны хлопец у групе. Прызнаецца, што дзяўчаты аказвалі яму знакі ўвагі, але ён адразу папярэджваў: сэрца ўжо занятае іншай.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

# ПАМІЖ «ЛАЙКАМІ» І РЭАЛЬНАСЦЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Часцей за ўсё элементы медыяадукацыі ўкараняюцца на ўроках чэшскай, замежных моў, гісторыі, сацыяльных навук. Для прыкладу, **на ўроках гісторыі педагогі могуць працаваць з картамі, карыкатурамі і... зборнікамі коміксаў,** якія могуць сказаць нават больш, чым фота, а высвятленне пазіцыі стваральніка карыкатуры дазваляе вучням убачыць падзеі з розных бакоў, прааналізаваць розныя пункты гледжання, паглыбіцца ў адпаведны кантэкст гістарычнай эпохі. Ёсць школы, дзе ўдалося паспяхова ўключыць медыяадукацыю ў фізіку, геаграфію і выяўленчае мастацтва. Увогуле, як адзначае Ян Йірак, вельмі шмат залежыць ад асобы педагога і яго крэатыўнасці.



«Мы паедзем у Беларусь?». Урок гісторыі ў прыватнай гімназіі міжнародных і грамадскіх зносін у Празе.

## «ПАЕДЗЕМ У БЕЛАРУСЬ?»

У прыватнай гімназіі міжнародных і грамадскіх зносін у Празе галоўным «ідэолагам» і «рухавіком» медыяадукацыі выступае **намеснік дырэктара па педагогіцы, настаўнік чэшскай мовы і гісторыі Івана КЛАБАЛАВА-ВЕСЯЛКОВА.** Установа адукацыі, у якой яна выкладае, рэалізуе праграму васьмігадовай, шасцігадовай і чатырохгадовай гімназіі. Гімназія фінансуецца як з дзяржаўных датацый, так і са сродкаў бацькоў, але па чэшскіх законах сродкі на аплату працы педагогаў выдзяляе толькі дзяржава. **Бацькоўскія грошы на заробкі настаўнікам накіроўваць забараняецца —** такім чынам педагогаў страхуюць ад сітуацыі, калі бацькі вучняў могуць заявіць, што плацяць ім заробтную плату.

**«Дні медыя — гэта не шоу і не забава. Адказваць на пытанні школьнікаў бывае вельмі няпроста, гэта даволі стрэсавае мерапрыемства...»**

— Наша гімназія не самая дарагая — 45 тысяч крон у год (каля дзвюх тысяч еўра. — **Аўт.**). Для параўнання, ёсць у горадзе гімназіі, дзе плата даходзіць да 150 тысяч. Да таго ж сродкі можна ўносіць часткамі. А калі ў гімназіі вучыцца некалькі дзяцей з адной сям'і, мы зніжаем для іх плату, — тлумачыць Івана. — Школа для багатых — гэта не пра нас. За што бацькі гатовы плаціць? Мы можам гарантаваць невялікую напаўняльнасць класаў — каля 20 чалавек, а ў звычайных школах у класе можа быць адначасова да 33 вучняў (у Чэхіі фінансаванне школ залежыць ад колькасці навучэнцаў. — **Аўт.**). Плюс у нас ёсць спецыялізацыя: для вучняў, якія навучаюцца па васьмігадовай праграме, гэта паглыбленае вывучэнне замежных моў. Першая абавязковая — англійская, другая — іспанская ці нямецкая на выбар. А на пятым годзе навучання яны выбіраюць трэцюю мову (рускую ці французскую).

У гімназіі працуе спецыяліст па міжнародных сувязях, які шукае партнёрскія школы ў розных краінах: Германіі, Аўстрыі, Іспаніі, Балгарыі, Кітаі, ЗША. Школы абменьваюцца вучнямі. Гэта могуць быць як кароткатэрміновыя выезды, так і выезды на паўгода ці нават год. Ці варта здзіўляцца, што з'яўленне беларускіх педагогаў у школьным класе дзеці радасна ўспрынялі як сігнал: "Паедзем у Беларусь?!»

## ПОЎНАЕ ПАГЛЫБЛЕННЕ

— Вядома, мы выконваем рамачную адукацыйную праграму, але разумеем, што ў дадатак павінны даць нашым вучням яшчэ штосьці, — расказвае настаўніца. — У нас дадатковая спецыялізацыя, адобраная міністэрствам адукацыі, — міжнародныя адносіны і PR. Палова педагогаў гімназіі рэалізуюць розныя нетрадыцыйныя методыкі навучання. У нас ёсць настаўнікі замежных моў, якія актыўна выкарыстоўваюць методыку гейміфікацыі. Сутнасць у тым, што вучні іграюць нейкую ролю ў прапанаваным сюжэце, навучанне адбываецца ў форме гульні і суправаджаецца сістэмай узнагарод — дзеці пераходзяць на наступны ўзровень. Напрыклад, вывучэнне тэмы прафесій на ўроках іспанскай мовы адбывалася наступным чынам: усе сталі ўдзельнікамі дэтэктыўнай гісторыі — адбылося злачынства, а падазраванымі — людзі самых розных прафесій. Пакуль гімназісты разбіраліся ў дэтэктыўным сюжэце, паралельна вывучалі лексіку, звязаную з прадстаўнікамі тых ці іншых прафесій і папаўнялі свой слоўнікавы запас.

Сама Івана практыкуе edularp — ролевыя гульні з поўным паглыбленнем у прадмет вывучэння, зваротам да эмоцый і пачуццяў. Напрыклад, для вывучэння падзей Другой сусветнай вайны ў яе падрыхтавана гісторыя, дзе ў кожнага вучня ў класе свая роля. Ёсць там чэшская сям'я і чэшска-яўрэйская: яны спачатку сябруюць, а потым аддаляюцца адна ад адной. З разгортваннем гістарычных падзей кожны павінен рэагаваць на тое, што адбываецца. Пытанне ў тым, як менавіта рэагаваць. Гімназісты аказваюцца перад складаным маральным выбарам: як паступіць у той ці іншай сітуацыі, каб не страціць сваіх «блізкіх», але і не стаць «здраднікам». Гэта спрыяе развіццю эмпатыі — заглыбляе ва ўнутраны свет і эмацыянальны стан іншага чалавека.

## ПАМІЖ СУР'ЁЗНЫМ І БУЛЬВАРНЫМ

Да прыходу на цяперашняе месца працы Івана працавала ў гуманітарнай гімназіі, дзе медыяадукацыя выкладалася як асобны прадмет. Але такія выпадкі, хутчэй, выключэнне, часцей медыяадукацыя праходзіць як скразная тэма. У гімназіі міжнародных і грамадскіх зносін акцэнт у медыяадукацыі зроблены на праектнае навучанне: першы гадавы праект рэалізуецца вучнем на першым годзе навучання (па-нашаму гэта шосты клас школы. — **Аўт.**), апошні — на апошнім. Напрыклад, у першы год ім прапануецца праект «Як разумець медыя?» На працягу навучальнага года яны ў рамках чэшскай, англійскай моў, грамадазнаўства, фізікі, выяўленчага мастацтва працуюць над рознымі задачамі: ствараюць плакат па гісторыі медыя, уласны рэкламны плакат, разбіраюць удзел медыя ў выбарчай кампаніі, асвойваюць стварэнне відэаролікаў і здымаюць свой, выкладваюць яго на відэахостынг, вучацца рабіць рэпартаж, на ўроках замежнай мовы працуюць з замежнымі СМІ.

Вынікам з'яўляецца стварэнне газеты: дзелавой і бульварнай.

— Наколькі мы, настаўнікі, можам быць канкурэнтаздольныя ў дачыненні да YouTube? Самае правільнае, напэўна, гэта адштурхоўвацца ад вопыту нашых вучняў, — разважае Івана, — прапаноўваць ім тыя крыніцы інфармацыі, якімі яны карыстаюцца, каб падлеткі самі навучыліся аналізаваць праўдзівасць ці непраўдзівасць крыніц, да якіх яны звяртаюцца. Часта мы ўключаем у навучанне методыку крытычнага мыслення.




Вынікі праекта «Як разумець медыя?» — створаныя школьнікамі бульварная і сур'ёзная газеты.

З улікам спецыфікі гімназіі яе выхаванцы вывучаюць правы і абвязкі грамадзяніна, ствараюць сваю партыю, праводзяць выбары, знаёмяцца з юрыдычнай сістэмай (наведваюць сапраўдны суд), са знешняй палітыкай Чэшскай Рэспублікі (едуць у Вену, у цэнтральны офіс Еўрапейскай камісіі), робяць сімуляцыю пасяджэння ААН. І ўсё гэта праз вывучэнне медыя.

Між іншым, пры паступленні ў гімназію (на чатырохгадовую, шасцігадовую і васьмігадовую праграму) усе прэтэндэнты здаюць экзамены. Два гады таму дзяржава вырашыла ўзяць гэты працэс пад свой кантроль. Таму па матэматыцы і чэшскай мове школьнікі здаюць цяпер дзяржаўны экзамен. А трэці экзамен гімназія, у залежнасці ад уласнай спецыялізацыі, устанаўлівае свой.

## КРЫНІЦА ІНФАРМАЦЫІ — ТВІТЫ

Адной з самых паспяховых у рэалізацыі медыяадукацыі прафесар Ян Йірак лічыць пражскую гімназію на Затланцэ. Размова ідзе пра чатырохгадовую дзяржаўную гімназію, у якую паступаюць пасля заканчэння базавай школы (у 15 гадоў). Конкурс складае чатыры чалавекі на месца. Як паведамляецца на сайце гімназіі, тут рыхтуюць не толькі да працягу навучання, а да жыцця, таму вучаць, як правільна прадстаўляць сваю работу, ідэю, праект аўдыторыі, як дыскутаваць і весці перамовы, вучаць пошуку і крытычнаму аналізу крыніц інфармацыі, інтэрпрэтаваць тэксты розных відаў, пісаць работу ў адпаведнасці з універсітэцкімі крытэрыямі і патрабаваннямі.

**Змест медыяадукацыі трэба пастаянна актуалізаваць. Яе задача — сфарміраваць крытычнае стаўленне да ўсіх медыя.**

— Ні ў якіх дакументах не прапісана, як павінен рэалізоўвацца медыяадукацыйны складнік. Медыяадукацыя ў нас прысутнічае на розных прадметах, — расказвае **настаўніца чэшскай мовы Маркета ПЕЛЬЦОВА.** — Нядаўна ў краіне прайшлі парламенцкія выбары, якія далі педагогам багатую глебу для работы на ўроку. Напрыклад, мы разам з вучнямі аналізавалі загалоўкі ў газетах, вывучалі перадвыбарныя праграмы кандыдатаў, «твіты» Андрэя Бабіша (чэшскі бізнесмен, партыя якога выйграла выбарчую гонку. — **Аўт.**)... Калі ў гімназіі адбіралі кандыдата на пасаду настаўніка чэшскай мовы, перавагу аддалі таму, які пабудаваў свой паказальны ўрок на параўнанні розных відаў медыя. З трэцяга года навучання гімназістам прапануецца спецыялізаваны семінар «Свет медыя», які вядзе журналіст.

У гімназіі выходзіць электронны часопіс «Ластаўка». Ад папяровых носьбітаў у гімназіі свядома адмовіліся, таму што падлеткі іх ужо не ўспрымаюць.

Ніхто перыядычнасць выхаду часопіса не ўстанаўлівае. Галоўны рэдактар, а яго ролю выконвае настаўнік, выдзяляе кожнаму аўтару электронную старонку, на якой той сам вярстае свой артыкул і падбірае ілюстрацыю (калі фота бярэцца з інтэрнэту, абавязкова павінна згадвацца крыніца). Відавома, куратар вучнёўскія тэксты рэдагуе, але без згоды аўтара на ўнесеныя праўкі тэкст не размяшчаецца. Галоўнае — не навязаць сваё меркаванне, а перакануць юнага «журналіста».

## НЕ ШОУ І НЕ ЗАБАВА

Адна з самых важных падзей у гімназіі — Дні медыя.

У першы дзень з 8.00 да 9.30 праходзяць паралельна чатыры занятку, на якія запрашаюцца ў якасці гасцей прадстаўнікі СМІ: выдаўцы буйных газет, аўтарытэтныя журналісты друкаваных СМІ, інтэрнэт-выданняў, радыё, тэлебачання, спецыялісты ў рэкламнай галіне, спецыялісты па маркетынгу медыя і нават па фэйк-навінах. Кожны сам выбірае, каго ён хоча паслухаць і каму задаць свае пытанні. Затым іх змяняюць яшчэ чатыры спецыялісты. А школьнікі зноў выбіраюць...

— У нашых навучэнцаў павінна быць поўная карціна медыя — ад бульварнай прэсы да сур'ёзных СМІ. Імкнёмся навучыць іх адрозніваць розныя крыніцы інфармацыі для таго, каб яны паважалі сур'ёзных журналістаў і цанілі іх інфармацыю вышэй, — тлумачыць Маркета. — Мы вельмі доўга выбудоўвалі сетку кантактаў, якая сёння добра працуе. Журналісты, якія прыходзяць у гімназію, не атрымліваюць за гэта грошай, але яны робяць свой важны ўнёсак у медыяадукацыю.

Ян Йірак пастаянны госць гімназіі на Затланцэ. «Я тут сустракаю шмат сваіх сяброў, — смяецца ён. — Але Дні медыя — гэта не шоу і не забава. Дзеці заўсёды сур'ёзна рыхтуюцца да такіх сустрэч. Прызнаюся, што адказваць на пытанні школьнікаў бывае вельмі няпроста, гэта даволі стрэсавае мерапрыемства ...»

**Гімназісты аказваюцца перад складаным маральным выбарам: як паступіць у той ці іншай сітуацыі, каб не страціць сваіх «блізкіх», але і не стаць «здраднікам».**

Другі дзень прысвячаецца наведванню гімназістамі рэдакцый, прэс-цэнтраў, агенцтваў навін, радыё, тэлебачання, інтэрнэт-выданняў. Апошні раз для наведвання было прапанавана дзесяць месцаў. А трэці дзень адводзіцца на рэфлексію. Гімназісты ацэньваюць эфектыўнасць сваіх сустрэч і выстаўляюць балы. Для педагогаў гэта інфармацыя вельмі карысная пры складанні праграмы наступных Дзён медыя. Магчыма, не ўсім з запрошаных гасцей удалося данесці да вучняў патрэбную інфармацыю.

Дарэчы, у першай палове наступнага года **школьная інспекцыя плануе правесці маніторынг таго, як медыяадукацыя прадстаўлена ў школах і якімі кампетэнцыямі валодаюць вучні.** Падрыхтавана анкета з 30 пытанняў, якія правяраюць, ці могуць школьнікі адрозніць звычайны тэкст ад рэкламы, ці ведаюць маніпуляцыйныя тэхнікі і гэтак далей. Ян Йірак усміхаецца: «Паверце, калі б нам з вамі прапанавалі гэты тэст, над многімі пытаннямі мы моцна задумаліся б...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*
*Мінск — Прага — Мінск.*

**(Поўны тэкст шукайце на партале www.zviazda.by)**

*Пераемнасць традыцый*

# НАТХНЕННЕ З... МІНУЛАГА

## Юныя творцы, падхапіце эстафету!

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларуская піянерская арганізацыя запрашаюць школьнікаў 5—11 класаў прыняць удзел у рэспубліканскім конкурсе сачыненняў, эсэ, вершаў «Мая Беларусь. Мая Будучыня».**

Сумесны праект БРСМ і БРПА скіраваны на выяўленне і падтрымку таленавітай моладзі, фарміраванне ў яе патрыятычных каштоўнасцяў, павагі да гісторыі свайго народа, развіццё актыўнай жыццёвай пазіцыі, захаванне пераемнасці пакаленняў.

Прадметам конкурсу з'яўляюцца аўтарскія творы — сачыненні, эсэ і вершы на тэмы «Мая радзіма — Беларусь!», «Мой Прэзідэнт», «Мой родны кут, як ты мне мілы», «Мая Беларусь. Мая Будучыня». У іх школьнікам — актывістам БРСМ і БРПА — прапануецца ў творчай форме расказаць на рускай альбо беларускай мове пра сваю краіну, яе гісторыю, сучаснасць, багатую культуру, прыгажосць роднай мовы; сваю малую радзіму; ролю першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у станаўленні і развіцці незалежнай дзяржавы; беларускую моладзь і пра тое, што яе па-сапраўднаму хвалюе.

Плануецца, што конкурс пройдзе ў тры этапы: раённы (лістапад), абласны (снежань), рэспубліканскі і завершыцца 15 студзеня 2018 года. Журы разгледзіць прадстаўленыя ў тэрытарыяльныя камітэты БРСМ аўтарскія работы і вызначыць пераможцаў ва ўзроставых катэгорыях: 5—7 класы; 8—9 класы; 10—11 класы. Крытэрыямі ацэнкі твораў стануць творчы характар работы, арыгінальнасць, самастойнасць меркавання аўтара, паўната раскрыцця тэмы, пісьменнасць. Пераможцы будуць узнагароджаны прызамі і дыпломамі.

Нагадаем, рэспубліканскі конкурс сачыненняў, эсэ, вершаў «Мая Беларусь. Мая Будучыня» з'яўляецца складнікам аднайменнай шматступеннай маладзёжнай эстафеты творчасці.

Падрабязнасці і ўмовы правядзення конкурсу можна знайсці на інтэрнэт-партале «Моладзь Беларусі» brsm.by.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Тэхналогіі*

# СУЧАСНАЯ КАРТКА — НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

## БРСМ уручыў актывістам першыя маладзёжныя білеты новага ўзору



**Абноўлены маладзёжны білет грамадскай арганізацыі ўяўляе сабой пластыкавую картку, якая змяшчае ўсю неабходную інфармацыю, у тым ліку асабістыя даныя яе трымальніка, а таксама іншыя звесткі. На пярэднім баку білета пададзены прозвішча, імя, імя па бацьку члена арганізацыі, дата яго нараджэння, дата і месцы выдачы білета, а таксама фатаграфія і асабісты нумар. Кожнай карце прысвоены ўнікальны код прыналежнасці да вобласці і канкрэтнага тэрытарыяльнага камітэта — своеасаблівы аналаг аўтамабільнага нумара.**

Партнёрам праекта БРСМ «Маладзёжны білет — твая сацыяльная абарона!» выступіла беларуская кампанія «Autohelp» — адна з найбуйнейшых праграм лаяльнасці на прасторах Беларусі (больш за 550 тысяч актыўных картаў і сотні пунктаў іх прыёму). Новы маладзёжны білет павінен стаць рэальнай сацыяльнай падтрымкай для кожнага члена маладзёжнай арганізацыі.

Па словах **прадстаўніка Autohelp Сяргея ЛЫСЕНКІ,** іх уладальнікі аўтаматычна становяцца ўдзельнікамі лаяльнай праграмы кампаніі і змогуць скарыстацца паслугамі партнёраў гэтай сістэмы: набываць тавары са зніжкамі, удзельнічаць у эксклюзіўных акцыях (як у сталіцы і абласных цэнтрах, так і ў невялікіх населеных пунктах па ўсёй Беларусі).

«Па выніках шматгадовага супрацоўніцтва з БРСМ мы прыйшлі да распрацоўкі сумесных праграм, скіраваных на падтрымку маладзёжных ініцыятыў, умацаванне іміджу і сацыяльнай абароненасці нашай моладзі. Цяпер у нас дзейнічае пілотны праект. У хуткім часе мы пяройдзем да поўнамаштабнай рэалізацыі ўсяго комплексу мер», — адзначыў Сяргей Лысенка.

Новы білет таксама дазволіць саюзу моладзі не толькі выкарыстоўваць у рабоце сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, але і ўкараніць элементы электроннага дакументаабароту. Пластыкавая картка забяспечыць дакладны ўлік і перамяшчэнне членаў арганізацыі па прынцыпе «аднаго акна».

Выдача білетаў новага ўзору адбылася падчас правядзення маладзёжнага форуму, які аб'яднаў больш як 300 лідараў і актывістаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Маладыя на полюсе холаду*

# «ДЗЯДЫ» І НАВАБРАНЦЫ АНТАРКТЫДЫ

**Вельмі маладзёжным атрымаўся склад 10-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі: сярэдні ўзрост яе ўдзельнікаў — ад 25 да 35 гадоў. Пры гэтым сярод апошніх ёсць і тыя, хто адправіцца на Паўднёвы полюс Зямлі ўжо не першы раз. Маладзёжны адукацыйны цэнтр «Фіяльта», які напярэдадні старту юбілейнай экспедыцыі арганізаваў сустрэчу грамадскасці з беларускімі палярнікамі, даў яе ўдзельнікам наступныя характарыстыкі.**

**Аляксей ЗАХВАТАЎ**, інжынер-механік, выпускнік Мінскага аўтамеханічнага каледжа, неаднаразовы ўдзельнік і прызёр этапаў спаборніцтваў для пазадарожных аўтамабіляў, майстар на ўсе рукі (і слесар, і зваршчык, і кіроўца). У экспедыцыі ўдзельнічае трэці раз.

**Максім ГАРБАЦЭВІЧ**, інжынер-радыёметрыст, закончыў факультэт радыёфізікі БДУ, захапляецца матацыкламі, выконвае не толькі ролю навуковага супрацоўніка па даследаванні атмасферы і азонасферы, але ў выпадку неабходнасці добра спраўляецца з абавязкамі праграміста і электрыка. Камунікабельны, ураўнаважаны, адказны, непатрабавальны да быту. У экспедыцыі ўдзельнічае другі раз.

**Павел ШАБЛЫКА**, інжынер-геафізік, закончыў геаграфічны факультэт БДУ, добра спраўляецца з абавязкамі дзяжурнага па кампусе, стараецца гатаваць вынаходліва і разнастайна, захапляецца псіхалогіяй, пастаянна расце ў прафесійным плане, але яшчэ патрабуе пільнай «бацькоўскай увагі». У экспедыцыі — другі раз.

Дарэчы, Павел Шаблыка ўпершыню трапіў на полюс холаду ў 24-гадовым узросце, адправіўся туды стажорам-даследчыкам Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі, а вярнуўся малодшым навуковым супрацоўнікам. У экспедыцыі ён займаўся геалакацыяй і назіраннямі за ваганнямі магнітнага поля Зямлі і магнітнымі анамаліямі. Але паколькі яго работа вымагала пастаяннага знаходжання, так бы мовіць, на «свежым паветры», а метэаўмовы, у прыватнасці моцны вецер (да 40 метраў за секунду), не заўсёды дазвалялі яму гэта рабіць, Паўлу давялося ўзяць на сябе і бытавыя пытанні. Ён, па словах нязменнага кіраўніка ўсіх беларускіх антарктычных экспедыцый Аляксея Гайдашова, стаў фактычна іх карміцелем, за што ўсе палярнікі былі яму вельмі ўдзячныя. Адсюль — і вынаходлівасць на кухні.



Фота БЕЛТА.

Сярод удзельнікаў экспедыцыі — маладыя твары.

Пасля яго вяртання ў Беларусь мы цікавіліся ў Паўла, да чаго немагчыма было падрыхтавацца, адпраўляючыся ў далёкае падарожжа, і што стала самым складаным у экспедыцыі.

— Ні да чаго немагчыма падрыхтавацца, бо гэта зусім іншы свет: стасункі ў замкнёнай прасторы, вялікія штодзённыя нагрузкі, адсутнасць сувязі, да якой мы ў будзённым жыцці прызвычаіліся і на якую не звяртаем увагі, складаныя кліматычныя ўмовы. Але жаданне зноў трапіць у экспедыцыю ў мяне ёсць, — канстатаваў ён.

Праз два гады хлопец вырашыў зноў вярнуцца ў Антарктыду. «Спадзяюся, што на гэты раз мне пашанцуе больш...» — смяецца ён.

Ёсць у экспедыцыі і навабранцы. Напрыклад, **Артур ІВАШКА** — майстар па рамонце і эксплуатацыі машын і механізмаў (ураўнаважаны, адказны, гаваркі, выдатны сем'янін). Ці ўрач **Дзмітрый КАЎКО**: ён таксама захапляецца матацыкламі і спортам, у экспедыцыі акрамя абавязкаў урача будзе выконваць работы па эколага-біялагічнай праграме, звязаныя з адборам проб і ўзораў прыродных матэрыялаў, а таксама адказваць за арганізацыю здаровага харчавання членаў каманды.

**Уладзімір НЕСЦЯРОВІЧ** — спецыяліст па рамонце і абслугоўванні будынкаў і камунікацый, навучаўся ў прафесійна-тэхнічнай навучальнай установе, дзе атрымаў прафесіі газаэлектразваршчыка і аўтаслесара. Можа быць у адной асобе і цесляром, і слесарам, і сантэхнікам. Як і большасць калег па экспедыцыі, захапляецца аўтамабілямі.

Усяго ў Антарктыду адправіліся сем чалавек. Там яны правядуць палярнае лета. Гэта найбольш спрыяльны час для экспедыцыі: тэмпература вагаецца ад +3 да -28 градусаў, у той час як у зімовы перыяд яна апускаецца да -56 градусаў.

Задачы перад беларускімі палярнікамі сёлета стаяць не менш важныя і складаныя, чым у папярэдніх экспедыцыях. Яны працягнуць будаўніцтва і мантаж новай станцыі. У мінулым годзе быў закладзены другі аб'ект Беларускай антарктычнай станцыі — 8-секцыйны службова-лабараторны модуль. Усталяваная платформа і сабраная адна секцыя. Падчас сёлетняй экспедыцыі плануецца змантіраваць яшчэ тры секцыі. Па выніках сезона будуць уведзены ў строй чатыры паўнавартасныя секцыі для працы і пражывання з васьмі запланаваных на другім аб'екце. Дарэчы, любая з іх функцыянальная сама па сабе і можа выкарыстоўвацца па прызначэнні асобна. Для кожнага палярніка будзе адведзена невялікае памяшканне для пражывання, дзе ёсць усё неабходнае, у тым ліку санвузел, міні-кухня, спальнае месца. Для профільных навуковых дысцыплін абсталёўваюцца асобныя даследчыя лабараторыі. У перспектыве з'явіцца таксама амбулаторна-хірургічная секцыя. У 2019—2020 гадах Беларусь плануе перайсці да круглагадовых зімовачных мерапрыемстваў у Антарктыдзе.



«Гатэль» для палярнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Жыццёвая формула*

# Сёння — здароўе, заўтра — поспех

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі стартаваў шматпрофільны інтэрактыўны праект «БДУІР — веды і стыль жыцця». Ён разлічаны на тры гады. Праект складаецца з чатырох модуляў, кожны з якіх уключае мерапрыемствы, скіраваныя на здаровы лад жыцця і фізічную актыўнасць студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.**



Ініцыятыву БДУІР падтрымалі партнёры. Так, падчас рэалізацыі модуля «Універсітэт здаровага ладу жыцця» спецыялісты Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі і Мінскага гарадскога цэнтра здароўя будуць сустракацца са студэнтамі-першакурснікамі, адукоўваць іх у пытаннях рацыянальнага харчавання, рухальнага рэжыму і загартоўкі імунітэту.

Другі модуль прысвечаны актыўнаму ладу жыцця: пры падтрымцы Беларускай асацыяцыі студэнцкага спорту ва ўніверсітэце будуць ствараецца новыя спартыўныя секцыі, арганізоўвацца спартакіяды паміж студэнтамі і выкладчыкамі.

Трэці кірунак праекта — «Школа мужнасці і патрыятызму»: сумесна з ДТСААФ у адным з інтэрнатаў БДУІР будуць створаны аўташкола, секцыі студэнцкага судна- і авіямадэлізму, а на базах ДТСААФ — секцыі паветранага спорту.

Чацвёрты модуль «Універсітэт — тэрыторыя культуры» ўяўляе сабой праграму наведвання спектакляў, майстар-класаў, творчых сустрэч з артыстамі Купалаўскага тэатра.

Даючы старт праекту, рэктар БДУІР Міхаіл Батура адзначыў, што ініцыятыва насамрэч нарадзілася яшчэ ў 2013 годзе: тады ўніверсітэт перайшоў на навучанне па схеме «4 + 2» і трэба было вырашыць, як захаваць здароўе студэнтаў пры вельмі інтэнсіўным тэмпе вучобы.

Паводле задумкі была арганізавана група са старастаў першага курса (82 чалавекі). Яны наведвалі лекцыі па здаровым ладзе жыцця, арганізаваныя спецыялістамі розных профіляў, і перадавалі веды сваім аднагрупнікам — па методыцы «роўны навучае роўнага». У першы год правялі восем лекцый, акцэнт быў зроблены на арганізацыю здаровага і паўнавартаснага харчавання. Удзельнікаў праекта падзялілі па масе цела на тры групы. Для кожнай з іх было складзена 30 разнастайных комплексных абедаў, з лютага па чэрвень яны атрымлівалі бясплатнае харчаванне ў сталовай універсітэта. У выніку нармальны індэкс масы цела стаў больш чым у 90 працэнтаў удзельнікаў праекта. Усе студэнты з групы з павышанай масай цела перайшлі ў групу з нармальнай.

Такія вынікі выклікалі цікавасць у студэнтаў іншых сталічных ВНУ. І ўжо ў 2014 годзе да ідэі БДУІР далучыліся яшчэ пяць універсітэтаў. На другі год ажыццяўлення праекта акцэнт быў зроблены на прафілактыцы сардэчна-сасудзістых захворванняў. Удзельнікі атрымалі дзённікі харчавання, а для пункта ахovы здароўя ўніверсітэта быў набыты кардыёграф, які дазваляе вызначаць стан сэрца за пяць хвілін.

Колькасць лекцый вырасла да пятнаццаці, да таго ж дадаліся практычныя заняткі. Праграма пракекта была пашырана: павялічылася колькасць трэнінгавых заняткаў, была дэталёва прапрацавана тэматыка прафілактычных мерапрыемстваў пры сардэчна-сасудзістых захворваннях, распрацавана меню з улікам агульнай захваральнасці па ўніверсітэце і рэкамендацый па правільным харчаванні для студэнтаў, павялічана асартымент дыетычных прадуктаў у сталовай і буфетах ВНУ.

У якасці трэнераў, акрамя прыцягнутых спецыялістаў, працавалі і выпускнікі папярэдняга года, якія атрымалі сертыфікаты «Трэнер па пытаннях захавання і ўмацавання здароўя». Упершыню ў праекце ўдзельнічалі замежныя студэнты, якія навучаюцца ў БДУІР.

У 2015 годзе да руху за здаровы лад жыцця далучыліся яшчэ шэсць ВНУ, у тым ліку і Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны (заняткі для яго студэнтаў трансляваліся праз відэаканферэнцсувязь).

У рамках праграмы трэцяга сезона ў БДУІР было праведзена ўжо 25 практычных, лекцыйных, трэнінгавых і выязных заняткаў. Асаблівая ўвага ўдзялялася душэўнай раўнавазе студэнтаў, а таксама выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Вынікам агульных намаганняў медыкаў і педагогаў стала комплексная мадэль падтрымання і захавання здароўя сучаснай моладзі. Усяго за тры гады свайго існавання прафілактычны праект паспяхова вырас да рэспубліканскага маштабу. І ўжо ў 2016/2017 навучальным годзе да яго далучыліся 37 ВНУ краіны. Паколькі праграма, якая дзейнічае падчас чацвёртага сезона, скіраваная на рухальную актыўнасць студэнтаў, старастам першага курса ў пачатку сезона былі раздадзеныя фітнес-бранзалеты, праграма для якіх была распрацавана ў БДУІР.

— У гэтым годзе адбыўся першы выпуск студэнтаў, якія навучаліся па сістэме «4 + 2» і якія прайшлі праз праект «Мой стыль жыцця сёння — маё здароўе і поспех заўтра». Калі развітваліся з выпускнікамі, яны казалі, што ідэі, якія прапагандуе праект, ляглі ў аснову іх ладу жыцця, — падкрэсліў рэктар. — Сёння яны выйшлі з універсітэта маладыя, здаровыя і паспяховыя і могуць спакойна рэалізоўвацца ў сваёй прафесіі. Мы скончылі чатырохгадовы цыкл і ахапілі больш за 8 тысяч студэнтаў толькі ў нашай ВНУ. Але БДУІР на гэтым не спыніўся. У гэтым годзе мы вырашылі зрабіць інтэграваны праект, які выходзіць на асэнсаванне і рэалізацыю дэвіза ўніверсітэта «БДУІР — веды і стыль жыцця». І калі з ведамі ўсё ясна, то стыль жыцця — гэта не толькі здароўе, але і выхаванне духу патрыятызму, заняткі спортам і культурнае развіццё. Чым мы і будзем займацца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Інавацыі ў адукацыі*

## Каб настаўнікі не адсталі ад часу

**Рэспубліканскі рэсурсны цэнтр адукацыйнай робататэхнікі адкрыўся на фізіка-матэматычным факультэце БДПУ. Ён аснашчаны самым сучасным навучальным камп'ютарным абсталяваннем, адукацыйнымі робатамі, 3D-прынтарам і іншай тэхнікай.**

Цэнтр нацэлены на навучанне студэнтаў сучасным інавацыйным інфармацыйным тэхналогіям, якія яны затым будуць актыўна прымяняць у сваёй прафесійнай дзейнасці, праведзенне заняткаў са школьнікамі, арганізацыю навучальных курсаў па адукацыйнай робататэхніцы і павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў. Ён стане часткай «Педагагічнага STEAM Парка», які ствараецца ва ўніверсітэце.

Падчас адкрыцця Рэспубліканскага рэсурснага цэнтра прайшоў майстар-клас, прысвечаны выкарыстанню набораў па робататэхніцы ў навучальным працэсе. Таксама госці сталі сведкамі футбольнага матча паміж камандамі робатаў. Канструявалі і праграмавалі іх навучэнцы старшых класаў сталічнай 20-й гімназіі (на яе базе функцыянуюць чатыры філіялы кафедраў БДПУ), а таксама навучэнцы гімназіі №74 і ліцэя БДУ пад кіраўніцтвам выкладчыка фізіка-матэматычнага факультэта БДПУ Аляксандра Францкевіча. Сярод іх былі і пераможцы нацыянальнага адбору WorldRobotics Olympia — 2017, удзельнікі зборнай Беларусі на FIRST Globalchallenge — 2017.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# «ГАЛОЎНАЕ — ШУКАЦЬ КАМПРАМІСЫ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Вольга збіралася ў журналісты. Два гады рыхтавалася, але зразумела, што па балах не пройдзе на бюджэт. І выбрала філфак, бо ёй добра давалася руская мова. Але ў будучыні не выключае, што ўсё ж такі трапіць у выдавецкую сферу.

Заканчваць універсітэт пара будзе ў адзін год. Абаіх чакае размеркаванне. Варыянтаў звычайна няшмат: або будзеш працаваць у школе, або ў перакладчыцкім бюро. Воля і Рома спадзяюцца застацца ў Мінску. Ці паехаць у Гомель. Вяртацца дадому ў Светлагорск не надта хочуць.

— Не, мы любім свой горад. Але, як ва ўсіх маленькіх гарадах, там мала перспектыў. На 70 тысяч жыхароў нават кінатэатра няма!

## Бацькі прасілі не спяшацца

Прапанову рукі і сэрца Рома зрабіў у мінулым кастрычніку, на Волін дзень нараджэння. Смяецца, што забіў двух зайцоў: купіў у падарунак ювелірны набор — завушніцы на дзень нараджэння, а пярсцёнак — на заручыны.

Пра тое, ці не рана яны рашыліся на такі крок, пара чула не раз. Нават Воліны бацькі прапаноўвалі не спяшацца і зладзіць вяселле праз год. Але маладыя былі ўпэўнены ў сабе. Дый ужо хутчэй хацелася жыць разам.

— Спачатку думалі толькі распісацца і пасядзець сям'ёй у кавярні. Але бацькі пераканалі, сказалі, што трэба, каб было як у людзей, — усміхаецца Рома. — Гасцей у нас было няшмат, 26 чалавек. І сукенку вясельную купілі: я ў салоне адразу адну прыкмеціў, папрасіў Волю памераць — ідэальна падышла.

— Вы ўдваіх выбіралі сукенку?

— Так, — ківае Рома. — Часам хаджу з Воляй на шопінг. Так атрымалася, што ў маёй сям'і мама — адзіная жанчына, і ёй прыходзілася знаходзіць «ахвяру», якая будзе ёй раіць, што купіць. Таму я прывык.

У якасці вясельнага падарожжа маладыя паехалі ў Егіпет: бацькі падарылі ім пуцёўку на 12 дзён.

Але хоціць рамантыкі, пяройдзем да быту. З чаго складаецца бюджэт студэнцкай сям'і? Пара не хавае: жывуць на стыпендыі і дапамогу бацькоў. Плюс Рома крыху накапіў, пакуль працаваў тры месяцы аніматарам. Кажуць, грошай ім хапае. «Калі вы ўжо сям'я, хочацца быць менш залежнымі ад бацькоў, — дзеліцца хлопец. — Гэта стымулюе нас шукаць падпрацоўкі. Я скончыў курсы вядучага мерапрыемстваў, на Новы год паспрабую сябе ў ролі Дзеда Мароза. А Воля ў перспектыве хоча навучыцца манікюру, ёй гэта падабаецца».

— Я так разумею, што галоўны ў сям'і — Рома, — раблю выснову, мяркуючы па тым, хто часцей адказвае на пытанні.

— Не, я проста больш балбатлівы, — смяецца той і запэўнівае: яны адно без аднаго важных рашэнні не прымаюць.

## Баршчы і сушы ад мужа

Дамашнія абавязкі пара дзеліць пароўну: Воля прыбірае, а Рома гатуе. «І вельмі добра, — хваліць мужа дзяўчына. — Ад яго сушы ўсе ў захапленні». А яшчэ Рома варыць баршчы, робіць плоў і мяса па-французску. У яго сям'і ўвогуле прынята есці шмат мяса. А ў Волі дома на стале часцей бываюць супы і выпечка.

На агульнай кухні, па словах студэнтаў, заўсёды свабодна. Жартуюць, што ў іх адчуванне, быццам бы гатуюць яны адны, а астатнія харчуюцца пельменямі і макаронай. Суседзі па інтэрнаце часта просяць пачаставаць. Так, аднойчы сям'я з Ірана зацікавілася Ромавымі рулецікамі з мяса і морквы. «Дзіўна, яны ж ведалі, што гэта свініна», — усміхаецца хлопец.



Гатаванне ў гэтай сям'і ляжыць на мужы.

Па магчымасці сям'я выбіраецца ў кіно ці на канцэрты. Раней хадзілі на балет: па ўзаемнай згодзе. «Мы не марнатраўцы, — на ўсякі выпадак заўважае пара. — Трацім толькі на неабходнае».

— Калі пасварыцеся, хто першым пойдзе мірыцца?

— Ну, давай шчыра, — пaглядае Рома на жонку. — Воля больш ганарлівая, таму ісці мірыцца першым прыходзіцца заўсёды мне.

— Я магу і два дні крыўдзіцца, хадзіць моўчкі па пакоі і не глядзець у Ромаў бок. А яму сумна без жонкі становіцца, вось і ідзе мірыцца, — апраўдваецца дзяўчына.

Але пасля Воля дадае: трэба часам пераступаць праз сваю гордасць, у сям'і па-іншаму ніяк.

— Калі вы ўжо вырашылі быць разам, неабходна шукаць кампрамісы, нават калі ты ўпэўнены, што маеш рацыю, — згаджаецца Рома. — І важна не прымаць рашэнняў на гарачую галаву. Якраз самым блізкім людзям мы часцей за ўсё робім балюча.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Рома прымярае касцюм Дзеда Мароза — рыхтуецца да навагодніх свят.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*



**Кацярына ЗАХАРЭВІЧ — паэт і празаік, калумністка часопіса «Маладосць» і галоўны рэдактар часопіса «Бярозка». Яе вясковыя зацемкі друкуюцца (у большай колькасці) у лістападаўскай «Маладосці» — нумары, прысвечаным жыццю ў вёсцы.**

# ВЯСКОВЫЯ ЗАЦЕМКІ

*(без прэтэнзій на ўсеабдымнасць і аб'ектыўнасць)*

*Урывак*

## БАБУЛЯ

Некалькі гадоў таму бабуля з дзедам пераехалі з хаты ў кватэру. Цудоўную, двухпавярховую, на чатыры пакоі, з усімі выгодамі цывілізацыі. У кожнага свой пакой, свой тэлевізар, і сваякоў-гасцей змесціцца нашмат больш, чым раней. Да горада пяць кіламетраў — маладзейшыя б і пешкі прайшлі, а цяпер навошта, калі машына ёсць? На кожным паверсе — па балконе, пад балконам — гародчык, якраз хопіць на цыбулю, моркву, агуркі і іншае. «Як добра, як зручна!» — дзівіцца бабуля і праз гады пасля пераезду.

Прачынаецца яна недзе а пятай — ні свіней, ні кароў, ні курэй даглядаць не трэба, але звычка засталася. Гатуе сняданак, спраўджвае каго на працу, каго ў школу — калі гасцююць дзеці ці ўнукі. Снедае, сядае мераць ціск. 140 на 100 — у космас не возьмуць, але па зямлі пахадзіць, дай божа, яшчэ дазволяць. Выпіла таблетку. Цяпер, лічы, вольная да самага абеду. Бабуля бярэ планшэт, пакінуты малодшай унучкай, знаходзіць у ім крыжаванкі і разгадвае іх хутка, спрытна.

Гатуючы абед, рухаецца павольна, грацыёзна і адначасова проста, па-свойску. Выглядае ўпэўненай, у сваёй стыхіі — робіць усё, між іншым, аўтаматычна, але з душой — рукі самі ведаюць.

Не датушыўшы бульбу з мясам, ламаецца мультыварка. «Даўно трэба было яе выкінуць! — кажа бабуля і лёгкім рухам ставіць каструлю з ежай на пліту. — Можа, табе ёгурт зрабіць?» І дастае кефір, замарожаную садавіну і блэндар.

Ці не цягне назад, у тую вёску, пытаюся. «Ай, не! — яшчэ крыху — і замахала б рукамі, адбіваючыся ад слоў. — Што там рабіць?»

Мне няёмка сказаць, што мяне часам цягне — да яблынь, кустоў з парэчкамі і агрэстам, да возу, засланага сенам, дзе мы з братам гулялі. Напэўна, таму, што я ніколі не даглядала там курэй, свіней, карову і агарод.

## ДЗЯДУЛЯ

Пакуль бабуля спраўляецца ў хаце, дзед працуе па-за ёй. Трэба схадзіць у краму, дагледзець гаспадарку малодшай дачкі, прывезці малодшую ўнучку пасля ўрокаў ці пасля гуртка, пагутарыць з суседкамі на лаўцы каля гаража.

Увесь дзень ён ходзіць туды-сюды, ненадоўга зазіраючы дадому і незаўважна даючы справаздачу: тое і тое зрабіў, пайду зараз па гэта і гэта. А самая важная справа — апякаць бабулю. Браць на сябе самую цяжкую працу і купляць для сваёй жонкі яблыкі. У гэтым няма пяшчоты, што транслюецца ў кнігах, кіно і сацыяльных сетках. Таму можа здацца, што тут увогуле няма пяшчоты. Ну якое можа быць каханне, калі яна ў гародзе, ён — у хляве? Я не памятаю, каб дзядуля дарыў бабулі кветкі ці мяккія цацкі. Самы яскравы стыль іх стасункаў — перагырквацца ці жартаваць адно з аднаго. Бабуля найбольш кпіць са звычкі дзеда сядзець на лаўцы з суседкамі, а ён... ён проста можа пасмяяцца, з чаго хочаш. Але дзед купляе бабулі яблыкі, калі сваіх яшчэ няма, а яна гатуе яму асобныя дыетычныя стравы па медыцынскіх паказаннях.

Я хацела, каб часткі «Бабуля» і «Дзядуля» былі аднолькавыя па памеры, але тут больш няма чаго сказаць.

# ЗНОЎ ПРА КУРЭННЕ

У Насты двое дзяцей. Па ёй і не падумаеш — паўтара метра росту, худая і шэрая, са светлымі кароткімі валасамі, звыкла прыбранымі ў нямодны хвост. Не ведаў бы — падумаў, што гэта страшненькая вучаніца выпускнога класа. Але ў Насты двое дзяцей, старэйшай гадоў дзесяць. Малодшаму гадоў шэсць ці сем, але не болей за тое. Абодва тонкія і нязграбныя, з крыху доўгімі сумнымі тварамі. Як і сама Наста.

Яна курыць, гэта нічога. Кажа, пачала так даўно, што кідаць проста сэнсу не мае, і, зрэшты, яна мае рацыю. Наста не перапынялася нават калі была цяжарная другі раз. Тады да будынка дайшло вялікае шчасце ўрбанізацыі — капрамонт. «Абнаўленне камунальных сістэм» гучыць цудоўна да таго моманту, калі падчас абнаўлення раскідваецца пад'езд і паступова перастае працаваць усё. Ліфт, напрыклад, не працаваў з самага пачатку і амаль паўгода пасля: яго таксама мадэрнізавалі.

Наста жыла на шостым паверсе, была цяжарная другі раз і рэгулярна выходзіла ў пад'езд курыць. Прыладжвалася на прыступках або прыхіналася да сцяны — як яшчэ адна дэталь навакольнай разрухі. Суседзі з верхніх паверхаў, якія штодзень змагаліся з лесвіцай у спробе трапіць дадому, спачатку віталіся з ёй, калі распазнавалі ў паўцемры. Потым кінулі — які сэнс, калі Наста ніяк не рэагуе на вітанні, толькі курыць і глядзіць з выразам незразумелай перавагі?



**Усё, што можна сказаць пра Марыю СВІСТ, яна сама просіць умясціць у два словы: дваццацігадовая мінчанка. Гэтая аўтарка «маладосцеўскай» прозы не бачыць сэнсу расказваць пра сябе больш, бо сімпатызуе «тэорыі» Ралана Барта пра тое, што пры нараджэнні тэксту яго аўтар «памірае» — тэкст пачынае жыць у свядомасці кожнага асобнага чытача. «З гэтай прычыны падрабязнасці біяграфіі вялікага значэння не маюць — значныя і знакавыя толькі тэксты».**

Ад Насты заўсёды пахне моцным танным тытунём, ад яе дзяцей — таксама. Мабыць, гэты пах наскрозь прапітаў усе іх рэчы і ўсю іх кватэру і ўжо невынішчальны.

Капрамонт скончыўся, ліфт адрамантавалі, а ў пад'ездзе не кураць болей. На лесвічнай клетцы паміж пятым і шостым паверхамі з'явілася вялікая пачварная пакаёвая расліна. Наста ўладкавалася касірам у маленькую крамку побач.

Крамка звычайная для невялікіх гарадоў, з тых, у якіх на прылаўках акрамя сасісак і ўчарашняга хлеба нічога няма, затое з віна-гарэлачным аддзелам у асобным памяшканні. Такіх крамак досыць у невялікіх гарадах, у сталіцы ж глядзіш на іх са здзіўленнем. Сталіцу праглынаюць карпарацыі, а яна і не супраць: зручней і працэй, ды і выбар большы.

Прыватныя крамкі — перажытак мінулага, але наўрад ці Насту гэта хвалюе. Яна сядзіць за касай, апранутая ў чырвоную форменную куртку з чужога пляча, валасы прыбраны ў хвост; і, прабіваючы чужыя дарагія цыгарэты, яна ўсё так жа глядзіць з выразам незразумелай перавагі.

А што ёй яшчэ застаецца?..



Ілюстрацыя Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА.



**Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ піша вершы і прозу, фантастыку — і не фантастыку. Зрэшты, самыя звыклыя рэчы могуць быць досыць фантастычнымі, асабліва калі прыгледзецца. У мінулым годзе ў яе выйшла кніжка апавяданняў «Яблыкі», за якую сёлета яна атрымала прыз Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Дэбют».**

# ЛАТАРЭЯ

*Урывак з апавядання*

Жылі яны ўдваіх у маленькай аднапакаёўцы — Андрэй Сямёнавіч і яго жонка. Жылі, як усе, — гэта значыць не лепш за іншых. Напэўна, і не горш.

Андрэй Сямёнавіч, вечарам вярнуўшыся з працы, еў боршч, а пасля хаваўся ад жонкі за штотыднёвікам з крыжаванкай і судоку. Жонка, заўсёды ў тым самым пярэстым халаціку, не міргаючы ўзіралася ў телевізар падведзенымі з самага ранку вачыма.

У тэлевізары людзі смяяліся, гаварылі і так прывабна мільгацела рэклама. Тут — маўчалі. Маўчанне лучыла гэтых дваіх нябачнаю ніткай, аб'ядноўвала лепей, чым самая вострая інтэлектуальная размова. Уздыхалі сінхронна, звыкла. І жыццё прамінала таксама па звычцы — у завучаным рытме, у адзіным тэмпе.

У такім самым аднойчы зададзеным тэмпе — раз на месяц — жонка нязменна распачынала скандал. Нязмушана, быццам праводзіла запалкаю па каробачцы, кідала ў мужа рэзкай фразай, заўсёды адной і той жа. Муж распальваўся адразу, успыхваў, крычаў, тупаў нагамі, наступаючы на жонку, размахваючы рукамі, быццам хацеў ухапіць за халацік. Жонка хавалася на кухні і голасна выкрыквала абразы ўжо адтуль.

Яны ведалі адно аднаго досыць даўно, а таму былі ў курсе, дзе баліць, дзе ўсё яшчэ смыляць душэўныя раны. І не шкадавалі солі. І абыякава наракалі адно на аднаго — быццам і без асаблівай ахвоты, а па абрыдлай звычцы. «Каб усё было як у людзей».

І — было. Як у людзей.

Аднаго разу Андрэй Сямёнавіч прыйшоў нейкі дзіўнавата разгублены. Нязвыклы. Сеў, падсунуўшы чорную скураную торбу пад табурэт, і нават не зірнуў на адвечны боршч. Жонка, звузіўшы вочы, паспела падумаць: «П'яны!..». Пасля думкі яе зачапіліся за «тую паскудзіну», суперніцу, з якою даводзілася за Андрэя Сямёнавіча, не шкадуючы сябе, змагацца. І яна сцялася ўнутры, і ў паветры адчувальна запахла навальніцаю.

Але муж загаварыў раней.

— Юлечка, — сказаў, аціраючы пот праваю рукою. — Мне тут на рабоце... таго... гэтага. Далі. Вось.

І левай няўпэўнена працягнуў Юлечцы нешта, быццам індульгенцыю. Жонка тарганула вуснамі і пакруціла ў пальцах кавалак навошчанай паперы. Паднесла да твару, прыжмурылася.

— Дай акуляры, — працадзіла скрозь зубы. І, ужо ўмацаваўшы на носе дадатковую пару вачэй, прачытала ўслых: — Латарэя? Пфуй!

— Сказалі, — пачаў жыва расказваць Андрэй Сямёнавіч, — сказалі: купі. Ну, я і купіў. Кажуць, выйграюць. Кватэры там. І ўвогуле.

— Лухта, — з веданнем справы адрэзала Юлечка. Адкінула паперчыну ад сябе, нават з грэблівасцю, і пляснула ў талерку боршч.

На другі дзень, пакуль Андрэй Сямёнавіч быў на працы, яна знайшла каляровую паперку ля люстра ў вітальні — мабыць, муж падняў з падлогі і прыладзіў пад гіпсавай фігуркай сабачкі.

— Ёлуп, — прамовіла Юлечка, пахітаўшы галавой. Муж часцяком здаваўся ёй дзіцем — гадоў гэтак пяці, не болей. Лупаў круглымі вачыма, быццам баранчык, на любыя пытанні любіў адказваць «Н-не ве-едаю...», абы не вырашаць самастойна. Дзіця трэба было, быццам ляльку, апранаць, карміць ды ў належны час класці спаць. Часам дазваляць гуляць ці даваць нейкія даручэнні па гаспадарцы, каб выхоўваць, але не болей за тое. На гэтым караблі капітанам піратаў заўжды была Юлечка, а Андрэй Сямёнавіч, нягледзячы на немалы жывот, шырокія плечы ды пасівелыя вусы, — юнгам.

Яна пацягнулася, каб скамячыць білет ды ўкінуць у смецце, але раптам стрымалася.

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Бобруйсктранс», г. Бобруйск, ул. Минская,123 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Изолированное помещение №2 | Помещение транспортного назначения | 259,2 | 710/D-82255 | Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 123-2 |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 741000000005001187 пл. 5,3080 га, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Минская, 123 – предоставлен в общую долевую аренду до 05.11.2112 г. Покупателю после приобретения предмета аукциона будет оформлена доля в праве аренды на общий земельный участок согласно законодательству Республики Беларусь | | | |

**Начальная цена без НДС – 60 800 бел. руб. (BYN)**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок заключения договора купли-продажи** | 5 (Пять) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов |

**Условия оплаты предмета аукциона**

